ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 101 (2154)
16 снежня ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

15 снежня ў Маскве ў Вялікім Крамлёўскім Палацы адкрылася другая сесія Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання. На парадку дня сесіі наступныя пытанні:

1. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1967 год.
2. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1967 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1965 год.
3. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

З дакладам па першаму пункту парадку дня—«Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1967 год»—выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыня Дзяржплана СССР дэпутат Н. К. Байбакоў.

З дакладам па другому пункту парадку дня—«Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1967 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1965 год»—выступіў міністр фінансаў СССР дэпутат В. Ф. Гарбузаў.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

13 снежня 1966 года Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС працягваў работу.

Пленум ЦК абмеркаваў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева «Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць камуністычнага руху».

У спрэчках выступілі т.т. Д. А. Кунаеў—першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана, М. Р. Ягорычаў—першы сакратар Маскоўскага гаркома КПСС, П. Я. Шэлест—першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны, В. С. Толсцікаў — першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС, А. П. Шыцікаў—першы сакратар Хабараўскага крайкома КПСС, Ш. Р. Рашыдаў—першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана, А. А. Грэчка—першы намеснік міністра абароны СССР, В. В. Грышын—старшыня ВЦСПС, І. І. Бадзюл—першы сакратар ЦК Кампартыі Малдавіі, М. У. Келдыш—прэзідэнт Акадэміі навук СССР, Т. Усубаліеў—першы сакратар ЦК Кампартыі Кіргізіі, А. А. Грамыка—міністр замежных спраў СССР, П. М. Машэраў—першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі.

Пленум ЦК аднагалосна прыняў пастанову «Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць Камуністычнага руху».

Пленум ЦК заслухаў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. М. К. Байбакова «Аб праекце Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1967 год» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. Гарбузава «Аб праекце Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1967 год».

Па гэтых пытаннях Пленум ЦК прыняў адпаведную пастанову.

Пленум выбраў тав. М. С. Саломенцава сакратаром ЦК КПСС.

На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.

КРОК ФЕСТЫВАЛЮ

ШАХЦЁРЫ—НАРОД ПЯВУЧЫ

Два дні ў Салігорску праходзіў гарадскі фестываль самадзейнага мастацтва. Гэта быў агляд народных талентаў маладога шахцёрскага горада нашай рэспублікі. Выступалі будаўнікі, шахцёры першага і другога калійных камбінатаў, настаўнікі, калектывы аўтабазы, камбіната бытавога абслугоўвання, гарадскога харчгандлю, прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча, музычнай школы...

Гаспадыняй агляду была песня. Спявалі хоры, вакальныя ансамблі, салісты. Запомніліся выступленні мужчынскай вакальнай групы першага калійнага камбіната, квартэта выкладчыкаў музычнай школы. Добрая злітнасць галасоў адчувалася ў дуэце спявачак Жук і Ражко. Песня «Явар і каліна» ў іх выкананні ўсхвалявала, запомнілася.

Неблагое ўражанне пакінула літаратурна-музычная кампазіцыя «Любімы горад» у выкананні самадзейнага калектыву першага калійнага камбіната. У ёй удзельнічалі хор, танцавальны калектыў, чытальнікі. У кампазіцыі былі скарыстаны вершы Ул. Нядзведскага і мясцовых паэтаў Аляксея Кур'яна і Васіля Рэпіна.

Гледачы цёпла прынялі музычны фельетон у выкананні самадзейных артыстаў Ф. Праконіна і А. Жукаўца пад акампанемент К. Яфім'янава (другі калійны камбінат).

На фестывалі выступілі танцавальныя калектывы Дома культуры будаўнікоў і першага калійнага камбіната. Танцоры Дома культуры будаўнікоў паказалі некалькі харэаграфічных работ. Прыемна, што ў іх рэпертуары ёсць беларускія танцы.

Варта асобна сказаць пра новую работу калектыву — «Вяселле». Гэта — кампазіцыя маладзёжнага вяселля з дружкамі і дружкамі, свацціяй і сватам, караваем, гасцямі-шахцёрамі. У кампазіцыі ўдала перададзена атмасфера весялосці. Але ўсё ж яна патрабуе грунтоўнай дапрацоўкі.

Былі цёпла прыняты гледачамі жартоўныя танцы «Вясёлыя пекары» і «Пеўні», пастаўленыя калектывам першага калійнага камбіната. Выканаўцы «Вясёлых пекараў» С. Баярын, В. Кірман і Н. Мілько паказалі добрае майстэрства. У рэпертуары калектыву таксама — «Рускі танец», «Лезгінка», «Венгерскі танец», «Малдаўская сюіта», «Зімушка», «Салігорская маладзёжная». Адразу ўзнікае пытанне: ці не замнога для аднаго калектыву? І тое, што мы ўбачылі, пераканала нас, што пагоня за колькасцю адмоўна адбілася на якасці. Танцы сырыя, недапрацаваныя.

Вельмі шкада, што ў рэпертуары калійнікаў няма беларускіх танцаў. Пастаноўшчыку «Салігорскай маладзёжнай» С. Баярыну не ўдалося знайсці свае, адметныя рысы. Зрэшты, гэтая кампазіцыя нагадвае звычайную маладзёжную польку. Адзіная адзнака прыналежнасці танца Салігорску — касцюмы мужчын.

Агульнае ўражанне: у Салігорску, безумоўна, ёсць нямала здольных людзей, улюбёных у мастацтва. Але з імі трэба настойліва працаваць.

Салігорск — буйны прамысловы цэнтр рэспублікі. Гарадскі фестываль самадзейнага мастацтва — падзея ў яго культурным жыцці. І крыўдна, што яна прайшла па-за ўвагай Дома мастацкай самадзейнасці Мінскага абласнога савета прафсаюзаў.

Н. СУРЖАН,
метадыст Мінскага абласнога Дома народнай творчасці.

СЕМІНАРЫ-КАНФЕРЭНЦЫІ

У сувязі з падрыхтоўкай да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва Міністэрства культуры БССР разам з Рэспубліканскім домам народнай творчасці і метадычным кабінетам культасветработы правялі ў Магілёве і Пінску семінары-канферэнцыі дырэктараў раённых дамоў культуры. У Магілёве сабраліся культасветработнікі Магілёўскай, Віцебскай і Гомельскай абласцей, у Пінску — дырэктары раённых дамоў культуры Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

На семінарах былі падрабязна прааналізаваны рэпертуар салістаў, чытальнікаў, харавых, музычных, танцавальных калектываў і мастацкіх агітбрыгад. Была таксама праведзена шырокая дыскусія на тэму, як арганізаваць тэматычны вечар, як укараняць новыя савецкія святы і абрады і інш.

Удзельнікі семінара ў Магілёве прагледзелі спектакль агіттэатра «Усмешка» Дома культуры завода штучнага валакна. Яны пабывалі ў гэтым Доме культуры на вечары пасвячэння юнакоў і дзяўчат у рабочыя. Бялыніцкі раённы Дом культуры запрасіў удзельнікаў семінара на тэматычны вечар «Чырвоны гваздзік», прысвечаны ветэранам рэвалюцыі, героям грамадзянскай і Айчыннай войнаў, а таксама паказаў цікавы спектакль першага на Магілёўшчыне самадзейнага тэатра юнага гледача «Дзяўчынка-прынцэса» па п'есе Л. Малюгіна.

А. РАДЗІВІЛАЎ.

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК КПСС

Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць камуністычнага руху

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Брэжнева Л. І. «Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць камуністычнага руху», Пленум ЦК КПСС пастанаўляе:

Цалкам і поўнасцю адобрыць палітычную лінію і практычную дзейнасць Палітбюро ЦК, накіраваную на ажыццяўленне выпрацаванага XXIII з'ездам партыі курсу ў галіне міжнароднай палітыкі і сусветнага камуністычнага руху.

Пленум адзначае, што, ведучы барацьбу супраць агрэсіўных сіл імперыялізму, паслядоўна праводзячы ленінскі курс мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльным ладам, ЦК КПСС і Савецкі ўрад дабіліся далейшага ўмацавання міжнародных пазіцый нашай краіны. Савецкі Саюз уносіць буйны ўклад у абарону ўсеагульнага міру і бяспекі народаў, у справу барацьбы працоўных мас за свабоду, мір і сацыяльны прагрэс.

Разам з тым, на шляху нармалізацыі міжнароднай абстаноўкі і ўмацавання міру сур'ёзныя перашкоды стварае агрэсіўная палітыка імперыялістычных дзяржаў, у першую чаргу амерыканскага імперыялізму, а таксама рэваншысцкіх колаў ФРГ. Неабходна і надалей аказваць цвёрды адпор ваяўнічым сілам імперыялізму і іх палітыцы ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін і распальвання ваенных канфліктаў.

Пленум адабрае пазіцыю Палітбюро і Савецкага ўрада па в'етнамскаму пытанню, лічыць неабходным і надалей аказваць усебаковую падтрымку гераічнай барацьбе в'етнамскага народа супраць злачыннай агрэсіі імперыялізму ЗША.

Надаючы вялікае значэнне справе ўмацавання еўрапейскай бяспекі, Пленум лічыць важнай задачай барацьбу за ажыццяўленне прынцыпаў, выкладзеных у дакументах Варшаўскай і Бухарэсцкай нарад першых сакратароў ЦК камуністычных і рабочых партый і кіраўнікоў урадаў краін Варшаўскага Дагавору.

Пленум ЦК асабліва падкрэслівае, што ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы, як ніколі, важна ўмацоўваць згуртаванасць і магутнасць сусветнай сістэмы сацыялізма, развіваць палітычнае і эканамічнае супрацоўніцтва паміж сацыялістычнымі дзяржавамі, мацаваць міжнародную салідарнасць рабочага класа, падтрымліваць народы, якія змагаюцца супраць каланіяльнага прыгнёту і неакаланіялізму, няўхільна праводзіць курс на ўмацаванне саюза з сіламі нацыянальнага вызвалення.

Пленум ЦК поўнасцю адабрае лінію і практычную дзейнасць Палітбюро і Савецкага ўрада ў галіне ўзаемаадносін паміж КПСС і Кампартыяй Кітая, паміж Савецкім Саюзам і Кітайскай Народнай Рэспублікай. Апошнія падзеі ў Кітаі, рашэнні XI пленума ЦК КПК сведчаць аб тым, што вялікадзяржаўная, антысавецкая палітыка Мао Дзэ-дуна і яго групы ўступіла ў новую, небяспечную фазу. Курс, які цяперашнія кіраўнікі КПК праводзяць на міжнародным арэне; іх палітыка ў адносінах да сацыялістычных краін; варожая кампанія супраць нашай партыі і савецкага народа і раскольніцкія дзеянні ў міжнародным камуністычным руху—усё гэта не мае нічога агульнага з марксізмам-ленінізмам. Такая палітыка, такія дзеянні наносяць шкоду інтарэсам сацыялізма, міжнароднага рабочага і вызваленчага руху, сацыялістычным заваёвам самога кітайскага народа і аб'ектыўна аказваюць дапамогу імперыялізму.

Пленум ЦК пацвярджае непахіснасць курсу нашай партыі на дружбу і інтэрнацыянальную салідарнасць з Кампартыяй Кітая, з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Разам з тым, Пленум лічыць неабходным рашуча выкрываць антыленінскія погляды і вялікадзяржаўны, нацыяналістычны курс цяперашніх кітайскіх кіраўнікоў, узмацніць барацьбу ў абарону марксізма-ленінізма, генеральнай лініі, выпрацаванай Маскоўскімі нарадамі 1957 і 1960 гг.

Ва ўмовах, якія склаліся, яшчэ большае значэнне набывае барацьба за згуртаванне ўсіх камуністычных і рабочых партый на прынцыповай аснове марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму. ЦК КПСС выказвае згоду з думкай брацкіх марксісцка-ленінскіх партый аб тым, што цяпер ствараюцца спрыяльныя ўмовы для новай міжнароднай нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый, якая павінна быць добра падрыхтавана ў ходзе ўзаемных кансультацый паміж партыямі.

Пленум ЦК КПСС заклікае партыйныя арганізацыі, усіх працоўных Савецкага Саюза сваёй стваральнай працай яшчэ больш памнажаць эканамічную і ваенную магутнасць краіны, паспяхова ажыццяўляць вялікія планы камуністычнага будаўніцтва, вызначаныя партыйнай праграмай і рашэннямі XXIII з'езда КПСС, дастойна сустрэць слаўнае пяцідзесяцігоддзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

АД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

14 снежня магілу Невядомага салдата ля Крамлёўскай сцяны наведалі дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР з Беларусі, якія прыбылі ў Маскву на другую сесію Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання. Мінутай маўчання ўшанавала беларуская дэлегацыя памяць Невядомага салдата і ўсклала вянок. На стужцы вянка напісана: «Ад дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР з Беларускай Рэспублікі».

Сярод усклаўшых вянок былі кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР В. І. Казлоў, Старшыня Савета Міністраў рэспублікі Ц. Я. Кісялёў і іншыя.

(ТАСС).

ВЫКАНАН ГАДАВЫ ПЛАН

Уключыўшыся ў спаборніцтва за дастойную сустрэчу 50-годдзя Савецкай улады, работнікі кніжнага гандлю рэспублікі 12 снежня выканалі гадавы план. У параўнанні з мінулым годам насельніцтву прададзена літаратуры больш як на паўмільёна рублёў.

НАРОДНЫ МУЗЕЙ Ул. І. ЛЕНІНА

У Магілёве створан народны музей Ул. І. Леніна. Загадвае ім на грамадскіх асновах афіцэр у адстаўцы У. Багайчук. У музеі абсталяваны стэнды, фотавыстаўкі.

Нядаўна афармлены яшчэ два цікавыя стэнды. На іх выстаўлены кнігі правадыра, якія выходзілі ў многіх краінах свету. Свае кнігі з аўтографамі даслалі музею Маршал Савецкага Саюза А. Яроменка, Герой Савецкага Саюза Р. Мачульскі, пісьменнікі Л. Собалеў, С. Смірноў.

НОВЫЯ ВЫКАНАЎЦЫ, НОВЫЯ ТВОРЫ

Дом культуры Мінскага тонкасуконнага камбіната перапоўнены. Сёння тут праходзіць фестываль самадзейнага мастацтва калектываў прадпрыемства. З розных вытворчых участкаў камбіната — апаратна-прадзільнага, ткацкага і іншых—на сцэну Дома культуры выйшлі аматары самадзейнага мастацтва.

За час падрыхтоўкі да фестывалю на камбінаце створаны новыя калектывы — хор ткацкай вытворчасці (50 чалавек), эстрадны ансамбль Дома культуры. Першую рэпетыцыю правялі ў жніўні 1929 года. На спеўку сабралася каля 50 чалавек. Вокны завесілі посцілкамі, старэйшыя сачылі, каб не наляцела паліцыя. Праз месяц сяляне Лявонавіч слухалі першы канцэрт. Выконваліся беларускія народныя песні «А ў бары-бары». «Сіротанка», «Рабіначка», «Чаму ж мне не пець» і іншыя.

17 верасня 1939 года... Гэты дзень ніколі не забудуць у Лявонавічах. Савецкая Армія перайшла граніцу. Сяляне засыпалі вызваліцеляў букетамі жывых кветак.

У хоры загучалі новыя песні, якія праслаўлялі чалавека-працаўніка.

У час Вялікай Айчыннай вайны многія харысты пайшлі на фронт, змагаліся з ворагам у партызанскіх атрадах. Некаторыя з іх не вярнуліся з поля бою. Сярод іх — Міхал і Уладзімір Новікі. У лагеры смерці Калдычэва загінуў каваль Васіль Бянько. Выпадкова выратаваўся ад смерці ў гэтым канцлагеры Сяргей Новік — арганізатар і кіраўнік хору.

Скончылася вайна. Зноў пачаліся рэпетыцыі хору. У гэты час хор узначальваў Аляксандр Кіеня. Ужо ў 1951 годзе лявонавіцкія спевакі занялі першае месца на раённым і абласным аглядах мастацкай самадзейнасці.

Мяняліся кіраўнікі хору. Некаторы час з калектывам працаваў самадзейны кампазітар, заслужаны дзеяч культуры рэспублікі Павел Касач. Цяпер хорам кіруе выкладчык Нясвіжскай музычнай школы Станіслаў Лагіновіч. Нязменны баяніст хору, яго канцэртмайстар — выкладчык гэтай жа школы Міхал Горын.

Слава пра Лявонавіцкі хор разнеслася па ўсёй Беларусі. Ён выступае з канцэртамі ў раёне, на абласных аглядах, на рэспубліканскіх дэкадах мастацкай самадзейнасці. Калектыў неаднаразова даваў канцэрты па радыё і тэлебачанні. За творчыя поспехі хор узнагароджвалі прэміямі, ганаровымі граматамі.

ЛЯВОНАВІЦКАМУ ХОРУ—СОРАК ГАДОЎ

З даўніх часоў у вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага раёна любяць песню. Спяваюць тут і маладыя, і людзі пажылога веку.

Летам 1926 года ў вёску з Вільні прыехаў Сяргей Новік — жыхар Лявонавіч, слухач беларускіх настаўніцкіх курсаў. Юнак слухаў песні землякоў, спяваў і падыгрываў ім на скрыпцы. Пелі рэвалюцыйныя і народныя песні. Спявалі ціха, каб не дачуліся паліцаі. Асабліва любілі песню «Смело, товарищи, в ногу».

У той час у Сяргея Новіка нарадзілася думка — стварыць хор. Яго горача падтрымала вясковая моладзь. Першую рэпетыцыю правялі ў жніўні 1929 года. На спеўку сабралася каля 50 чалавек. Вокны завесілі посцілкамі, старэйшыя сачылі, каб не наляцела паліцыя. Праз месяц сяляне Лявонавіч слухалі першы канцэрт. Выконваліся беларускія народныя песні «А ў бары-бары». «Сіротанка», «Рабіначка», «Чаму ж мне не пець» і іншыя.

У лютым 1963 года хору прысвоена ганаровае званне народнага.

Сёння ў хоры спяваюць 70 чалавек — перадавікі калгаснай вытворчасці, сельская інтэлігенцыя. Калгасніца Надзея Федзічкіна ўдзельнічае ў хоры з 1948 года. Толькі нядаўна пакінула хор пенсіянерка Надзея Шынгель. Але яна падрыхтавала сабе добрую змену: у хоры спяваюць яе дочкі — Валянціна, Ірына і Людміла. Валянціна — салістка хору. Пасля выступлення ў канцэрце Другой дэкады мастацкай самадзейнасці яна была ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Спяваюць у хоры трактарыст Адам Лурко, пенсіянер Феафан Будзько і многія іншыя.

Да фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, калектыў рыхтуе новую праграму. У ёй пачэснае месца займуць беларускія народныя песні, песні прафесіянальных і самадзейных беларускіх кампазітараў.

Заўтра ў раённым Доме культуры адбудзецца ўрачысты вечар — ушанаванне Лявонавіцкага народнага хору. Чатыры дзесяцігоддзі жыве і працуе гэты цікавы самабытны калектыў — жамчужына самадзейнага мастацтва нашай рэспублікі. Будуць кветкі, будуць віншаванні і пажаданні ўдач і творчых поспехаў. А галоўнае, будзе канцэрт, адзін з тых, што прыносіць нам, слухачам, сапраўдную радасць і асалоду.

Віктар КАНДЫБОВІЧ.

У сельгасарцелі «Перамога» Баранавіцкага раёна ва ўсіх васьмі брыгадах пабудаваны прыгожыя клубныя будынкі. У дні падрыхтоўкі да фестывалю у гонар 50 годдзя Савецкай улады створаны новыя харавыя калектывы, духавы аркестр.

На здымку—духавы аркестр калгаса «Перамога» на рэпетыцыі. Справа — кіраўнік аркестра шафёр-камбайнер Леанід Фядзюк.

Фота А. ПЕРАХОДА (БЕЛТА).

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК КПСС

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПЛАНЕ РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СССР І ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ СССР НА 1967 ГОД

Адобрыць у асноўным праекты Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР і Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1967 год.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПА КІЕЎСКІМ ТЭЛЕБАЧАННІ

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача вярнуўся днямі з кароткатэрміновай гастрольнай паездкі ў сталіцу братняй Украіны. Наш карэспандэнт звярнуўся да дырэктара тэатра А. Вольскага з просьбай падзяліцца ўражаннямі аб паездцы.

— У нас даўняя дружба з Кіеўскай студыяй тэлебачання, — сказаў ён. — Юныя гледачы Украіны добра знаёмы з многімі нашымі спектаклямі. На працягу рада год мы рэгулярна выязджаем у Кіеў.

У гэтую паездку мы паказалі ўкраінскім сябрам свае новыя пастаноўкі. Гэта быў спектакль па вядомай казцы Аляксея Талстога «Прыгоды Бураціна» і трагедыйнае прадстаўленне па п'есе Вадзіма Карастылёва «Варшаўскі набат». Абодва спектаклі, як нам стала вядома, атрымалі добрыя водгукі шматлікіх гледачоў.

Камітэт па радыёвяшчанню і тэлебачанні пры Савеце Міністраў УССР ўзнагародзіў Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача Ганаровай граматай.

У НОВЫМ ВАРЫЯНЦЕ

У Беларускім акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы пачаліся рэпетыцыі п'есы А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў». Спектакль прысвячаецца 50-годдзю Савецкай улады.

У свой час «Канстанцін Заслонаў» з вялікім поспехам ішоў у буйнейшых тэатрах нашай краіны. Народныя артысты СССР Б. Платонаў і Г. Глебаў стварылі ў спектаклі купалаўскага тэатра незабыўныя вобразы. Аднак на гэты раз тэатр не проста звяртаецца да сваёй старой работы. Аўтар значна перапрацаваў п'есу, увёў новыя карціны. Ствараецца новае музычнае і мастацкае афармленне.

Да ўдзелу ў спектаклі прыцягваюцца маладыя сілы. У галоўнай ролі выступяць заслужаныя артысты БССР В. Тарасаў і М. Яроменка. Мастак спектакля—студэнт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Б. Герлаван. Кампазітар — Д. Смольскі. Рэжысёр-пастаноўшчык—Б. Ганага.

П'ЕСА СВАЯ, МАГІЛЁЎСКАЯ

«Мурын двор» — так называецца п'еса журналіста з Магілёва І. Ісачанкі. Яна апавядае аб сялянскім паўстанні на Крычаўшчыне супраць памешчыцкага прыгнёту ў XVII стагоддзі пад кіраўніцтвам Вашчылы. П'есу маладога драматурга ставіць галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Б. Валадарскі. У гутарцы з нашым карэспандэнтам ён паведаміў:

— Прэм'еру новага спектакля магіляўчане ўбачаць у пачатку лютага будучага года. У галоўных ролях заняты пераважна вядучыя артысты тэатра. Ролю галоўнай гераіні Муры будуць выконваць заслужаная артыстка БССР Ю. Гальперына і заслужаная артыстка КаССР Н. Фядзяева, Дзяніса—народны артыст БССР С. Бульчык, палкоўніка — народны артыст РСФСР М. Радзіёнаў. Музыку да спектакля напісаў Юрый Семяняка.

ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ ГЛЕДАЧОЎ

У дні зімовых канікул юныя брэстаўчане заўсёды прыходзяць у Абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола. Чым парадуе тэатр маленькіх гледачоў сёлета?

Дырэктар тэатра Л. Валчэцкі расказаў карэспандэнту нашай газеты:

— Працуем над спектаклем па п'есе Г. Мамліна «Феерверк». Яго ставіць наш акцёр, нядаўні выпускнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Рыгор Баравік. У цэнтральных ролях выступяць заслужаныя артысты рэспублікі А. Асторына, С. Юркевіч, артысткі І. Фядотава, Н. Абрамава і іншыя. Добры падарунак школьнікам рыхтуе і лялечная група тэатра. На сцэне ажыве вядомы твор Аркадзя Гайдара «РВС», які ставіць Аляксандр Сяргін. Спектакль прысвячаецца 50-годдзю Савецкай улады.

З новымі пастаноўкамі тэатра пазнаёмяцца школьнікі многіх гарадоў Брэстчыны.

У Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна адкрыта абласная выстаўка жывапісу, графікі і скульптуры. На ёй экспануецца больш 150 работ мастакоў і скульптараў Гомельшчыны.
На здымку — у зале выстаўкі.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

ПРЫЗЫ ПЕРШАГА ТЭЛЕВІЗІЙНАГА...

Амаль два тыдні ў сталіцы Украіны свяціліся блакітныя экраны першага Усесаюзнага фестывалю тэлевізійных фільмаў. Журы, удзельнікі свята тэлемастацтва і шматлікія гледачы прагледзелі дзесяткі лепшых работ усіх студый краіны.

Вялікі прыз фестывалю прысуджаны шматсерыйнаму тэлефільму «Выклікаем агонь на сябе», пастаўленаму рэжысёрам С. Коласавым на студыі «Масфільм».

Прыза горада-арганізатара першага Усесаюзнага фестывалю тэлевізійных фільмаў удастоілася карціна «Вяселле» (Тбілісі). Журы па мастацкіх фільмах адзначыла прызам за лепшую рэжысуру музычна-эстрадную пастаноўку «6×6» Рыжскай студыі тэлебачання. Прыз за лепшую аператарскую работу атрымала стужка талінскіх майстроў малога экрана «Да суровага краю».

Лепшым выканаўцам мужчынскай ролі прызнаны народны артыст СССР М. Кручкоў, які выступіў у карціне «Гнёзды» («Масфільм»).

Па раздзелу музычных праграм прыза ўдастоілася тэлевізійная пастаноўка оперы С. Пракоф'ева «Ігрок» (Масква). Лепшай сярод карцін для дзяцей названа работа «Тры з паловай дні з жыцця Івана Сямёнава — другакласніка і другагодніка» (Перм).

У жанры фільмаў-спектакляў першынство аддадзена пастаноўцы «Алімкан» Фрунзенскай студыі. Адзначана ігра народнага артыста РСФСР В. Акімава ў ролі адваката Андэрсана ў тэлеспектаклі «Працэс Рычарда Ваверлі» (Волгаград) і ўкраінскай артысткі Т. Літвіненка ў фільме «Фауст і смерць» (Кіеўская студыя «Тэлефільм»).

Адзначаны таксама тэлевізійная навела «Лясны дождж» (Куйбышаў), «Музычны калейдаскоп» (Вільнюс), фільм-канцэрт «Мелодыі гор» (Арджанікідзе). За выкананне галоўнай ролі ў фільме «Тры з паловай дні з жыцця Івана Сямёнава...» атрымаў памятны падарунак школьнік Валодзя Варабей.

Сярод дакументальных стужак за наватарскае вырашэнне тэмы прыза ўдастоіўся фільм «Я сам» Тбіліскай студыі. Лепшым кароткаметражным дакументальным фільмам прызнаны «Нарула Базетаў» (Свярдлоўск), а поўнаметражным дакументальным фільмам — «Салдаты Айчыны» (Ленінград).

Тэлерэпартаж «Дарога лягла за экватар» (Уладзівасток) і прамы тэлерэпартаж, зняты на плёнку, — «Сімфонія» Кіеўскай студыі — падзялілі першае і другое месцы. Прыза за выдатную аўтарскую і аператарскую работу (тэлефільм «Южный — город вьюжный») удастоіўся тэлежурналіст В. Перавезенцаў з Паўднёва-Сахалінска. За пошукі тэмы і сцэнарый прыз атрымалі аўтары карціны «Чалавек нараджаецца для шчасця» (Мінск).

Журы па дакументальных фільмах, акрамя таго, адзначыла конкурсную работу рэжысёра С. Салахішвілі, фільмы «Пакароная пустыня» (Ташкент), «Алюміній» (Іркуцк) і іншыя.

Дыпломы Саюза кінематаграфістаў СССР прысуджаны дакументальным работам «Жыве чалавек у ваколіцы» (Харкаў), «Запавет» (Рыга) і мастацкаму кароткаметражнаму фільму «Апошні кідок» (Ерэван). Дыпломам Саюза кінематаграфістаў Украіны за цэласнасць акцёрскага ансамбля і высокую культуру рэжысуры ў экранізацыі для тэлебачання літаратурнага твора адзначана «Да суровага краю» (Талін).

Тэлефільмы «Ідзе па кручах маладосць мая» (Алма-Ата) і «Фабрыка манекенаў» (Масква) удастоіліся дыпломаў Саюза журналістаў СССР. Дыпломам «За творчы пошук у галіне тэлевізійнай публіцыстыкі», устаноўленым Маскоўскай арганізацыяй Саюза журналістаў СССР, узнагароджана дакументальная стужка «Рэпартаж па тэлефоннай кніжцы» (Талін). Работа Усць-Каменагорскай студыі «На мядзведзях» атрымала дыплом Саюза журналістаў Украінскай ССР — за лепшы тэкст.

□ □ □

Увечары 10 снежня адбылося ўрачыстае закрыццё першага Усесаюзнага фестывалю тэлевізійных фільмаў. Пераможцам былі ўручаны дыпломы і прызы.

ТЭАТР

БЯССІЛЬНЫЯ ДУШЫ І БЯЗДУШНАЯ СІЛА

«Варвары» М. Горкага на сцэне Гродзенскага драматычнага тэатра

ПАСЛЯ з'яўлення п'есы М. Горкага «Варвары» дарэвалюцыйныя крытыкі былі крыху збянтэжаны і, дэманстрацыйна пацiскаючы плячыма, пыталіся: «А хто ж варвары? Здаецца, жыхары Верхаполля нічога асаблівага не робяць і «зверствам» не вызначаюцца, а Чыркун з таварышамі — людзі цывілізаваныя. Каго ж Горкі адносіць да варвараў?»

Праз шэсцьдзесят год мы з вамі такіх пытанняў не задаём: паразумнелі, дзякаваць часу, і бачым у п'есе бязлітаснасць Горкага як да мяшчанскай здранцвеласці верхапольцаў, так і да цывілізаванага варварства інжынераў.

Тры героі прыязджаюць у Верхаполле, горад «мёртвай тугі». Адзін з іх — Цыганоў, герой з мінулага, не першай свежасці «свецкі леў», кумір паненак, разбэшчаны і цынічны; другі — Лукін — «з будучага», і таму ён з усмешкай недавер'я глядзіць на валтузню ў гарадскім жыцці-балоце. Тэарэтык Лукін не верыць у магчымасць пераадолець «варварства» сёння і пры ўсёй правільнасці поглядаў, застаецца бяздзейным, па сутнасці, змыкаецца з Чыркуном: лагодна-іранічная ўсмешка Лукіна родная бяздушнасці апошняга.

Нарэшце — Чыркун, чалавек справы, моцны, энергічны, бязлітасны ў сваёй прасталінейнай упартасці. Чыркун вабіць нянавісцю да звычайнага расійскага варварства, але сіла Чыркуна не сродак, а самамэта. І яна аказваецца слабасцю, поўнай бездапаможнасцю Чыркуна перад сапраўднай сілай чалавечай душы...

Гродзенскі тэатр, паставіўшы «Варвараў», імкнуўся з магчымай дакладнасцю паказаць сапраўдную вартасць Чыркуна.

Чыркун (С. Чарнакоў) у спектаклі рэзкі, часам крышку нязграбны ад перапоўніўшай яго энергіі. Ён нават часам любуецца сваёй «непадобнасцю» да іншых і прасталінейнай прынцыповасцю.

М. Горкі развенчвае Чыркуна тым, што паказвае яго няздольнасць адказаць на пачуцці Манахавай; усё астатняе толькі дапаўняе гэту асноўную характарыстыку. Аднак акцёр амаль усе сцэны з Манахавай праводзіць неяк збянтэжана, нават разгублена, асабліва ў канцы спектакля. Узнікае супярэчнасць — упэўнены ў сабе Чыркун баіцца Манахавай. І даводзіцца акцёру залішне падкрэсліваць бяздушнасць Чыркуна.

Адсюль вынікае, напэўна, і сухасць выканання, і адналінейнасць у паказе характару Чыркуна, што пазбаўляе гэты характар жывых жыццёвых рысаў. Паверыўшы ў адсутнасць у гэтым чалавеку сэрца, не разумееш, адкуль бярэцца ў ім тая прыцягальная сіла, тая прывабнасць, якой ён, літаральна, «зачароўвае» Манахаву, Лідзію і нават Анну, сваю жонку.

Актрысе А. Іванчук удаецца выразна перадаць цягу Манахавай да Чыркуна, імкненне заваяваць яго ўвагу. Перакананўча гучыць у выкананні актрысы туга Надзеі па сапраўднаму чалавеку. Але там, дзе пачуцці Манахавай успыхваюць полымем, дзе сіла яе кахання рве ўсе путы ўмоўнасці і крышыць перашкоды, — там паяўляецца недарэчная халоднасць і разважлівасць. Манахава — Іванчук нібы стараецца пераканаць усіх у тым, што яна любіць Чыркуна. Але гэта не патрэбна.

Тая ж бясспрасчаснасць, што ўласціва Чыркуну, адбіткам ляжыць на Манахавай — Іванчук. Цяжка паверыць, што пра такую Манахаву гавораць: «сильна эта женщина», і згаджаешся з Чыркуном, што такая Надзея не варта ўвагі, бо яна нічым не вылучаецца з верхапольскага асяроддзя.

Кажуць, прырода не церпіць пустаты. Яе не церпіць і драматургія: месца «выбыўшай» Надзеі заняла Анна.

Анна — Л. Ашуркова стала першай фігурай у спектаклі. Артыстка здолела выдатна перадаць самае галоўнае ў характары сваёй гераіні — безмежную любоў да свайго Ягора. Адданымі вачыма яна сочыць за Чыркуном, не разважае, а прымае ад яго ўсё, як ад вышэйшага суддзі.

Чыркун з прасталінейнай бязлітаснасцю заяўляе Анне, што не любіць яе. І любуецца сабой — вось які я! Не прыкідваўся, не падманваў, а адразу — і гатова! І ў гэтым самалюбаванні — вышэйшы падман і сапраўдная «вартасць» сілы Чыркуна. Анна ж, поўная любві, ідзе насустрач жаданням свайго мужа — спрабуе парваць з ім. Але — не змагла — і вінаваціць у гэтым толькі сябе: вось якая я слабая!

Пакуль Чыркуна няма побач, Анна непрыкметная, але як толькі ён з'яўляецца, Анна быццам ажывае, расцвітае: выразна бачыш яе трапяткое жаданне быць вартай свайго Ягора.

Сіла пачуцця Анны — Л. Ашуркова ставіць на першы план драму шчырай душы, што жыве з бяздушным чалавекам. І на фоне гэтай драмы расплываюцца і робяцца няпэўнымі фігуры Манахава, Лідзіі, Цыганова.

Цыганоў (В. Грэчынскі) не зусім такі, якім яго ўяўляеш па п'есе. Там Цыганоў — спустошаны пан, цынік, надзелены пэўнай праніклівасцю, — усё ж захоўвае нейкі лоск былога «льва». В. Грэчынскі больш выглядае чалавекам, які апусціўся.

Цыганоў — Грэчынскі добра разумее сапраўдную вартасць Чыркуна і не верыць яму. Ён першы кідае тыя словы, якія найбольш выразна акрэсліваюць гэтага героя — бяздушны, бессардэчны. А што далей? А вось гэта Цыганова якраз і не цікавіць. Хай сабе робіцца тое, што робіцца...

Цывілізаваны Цыганоў аказваецца горшым за «першабытных» верхапольцаў. Бязлітаснай іроніяй ахутаны ўсе яго дзеянні: ён прывучыў да п'янства дурня Грышу; ён падштурхнуў на злачынства нікчэмнага Драбязгіна, які нават украсці змог толькі нейкую драбязу; ён патурае жуліку Прытыкіну, жульніцтва якога трымаецца на нахабстве і ўпэўненасці, што ўсё сыдзе з рук. Нават цынізм — шчыт і меч Цыганова — аказваецца зламаным: гэты чалавек, які быццам бы ўсё зведаў і спазнаў, бездапаможны перад сапраўдным пачуццём, калі ён безнадзейна закахаўся ў Надзею.

Незвычайны ў спектаклі муж Надзеі Манахаў. Акцёр Я. Кімберг адмаўляецца ад асуджэння Манахава, ён малюе яго, як чалавека слабога, што скарыўся перад абставінамі жыцця. Манахаў няшчасны ў сваіх намаганнях утрымаць Надзею, пакрыўджаны, і гэта выразна даносіць акцёр. Але вобраз значна выйграў бы, калі б Я. Кімберг больш выразна падкрэсліў агіднае сябелюбства Манахава, варварскую бяздушнасць гэтага акцызнага чыноўніка, які кроў ад крыві і плоць ад плоці верхаполец, выдатна зжыўся з Рэдазубавым, Прытыкіным і Галавасцікавым.

Галавасцікаў (А. Бірычэўскі) — ідыёлаг верхапольцаў, канцэнтраванае выражэнне іх разумовых запатрабаванняў, заключаных у няспынным плятканстве, паклёпах і бязглуздых разважаннях, якім падаецца выгляд праўдашукальніцтва. У Галавасцікаве А. Бірычэўскі падкрэслівае заўсёдную гатоўнасць вынюхаць нешта, падкрэслівае і ўсведамленне ім сваёй сілы. Вось таму і знікае са сцэны гэты чалавечак з пагрозай, з упэўненасцю ў тым, што «ягоная возьме».

Сапраўды багаты «букет» сабраны ў Верхаполлі! Чаго варты адзін гарадскі галава Рэдазубаў, які паставіў слупы пасярод вуліцы і зрабіў дурнем свайго сына Грышу. Рэдазубаў — Б. Луканін губляецца перад Чыркуном не таму, што баіцца. Ён проста не можа ўявіць сабе, што яму, галаве горада, можна пярэчыць. Падарваная вера ў моц улады падрывае і ўсю яго жыццёвую ўстойлівасць. Б. Луканін яшчэ не ўсюды знайшоў лінію паводзін Рэдазубава і выглядае няўпэўненым з самага пачатку спектакля, яму не хапае той «авантажнасці», якая замяняе гарадскому галаве — галаву...

Да пары Рэдазубаву Прытыкін (С. Аляксандраў), які зразумеў «новыя павевы» з адзінага прыдатнага для сябе пункту гледжання — можна рабаваць больш бессаромна.

І ўвесь гэты «букет» нібы звязаны вобразам Дуньчынага мужа (С. Храмцоў), крывога люстэрка, у якім адбіваюцца намеры верхапольцаў. С. Храмцоў малюе свайго героя вартым жалю жабраком, у якога спачатку яшчэ захоўваюцца рэшткі сумлення, а пасля знікаюць і яны: са смешнай і брыдкай настойлівасцю намагаецца Дуньчын муж адхапіць свой кавалак, шантажыруючы дачку.

Асобна стаяць у п'есе і спектаклі доктар Макараў (А. Струнін) і Багаеўская (М. Кавязіна).

Багаеўская — Кавязіна — гэта чалавек вялікага жыццёвага вопыту; яна добра разумее, што прыйшлі новыя часы, а яе час скончыўся. Ёй не да спадобы новае, а зрабіць нічога не можа, бо няма ўжо ні сіл і ні часу. Адсюль у яе і сузіральнасць, і спакойная мудрасць, і нейкая прывабная элегічная туга па тых гадах, калі і яна магла нешта зрабіць. А зараз адзінае, што ў яе сілах, — папярэдзіць Анну і Лідзію (Л. Сторажава), паспачуваць...

Доктар Макараў — добрая душа, зломленая безнадзейным каханнем да Манахавай. Макараў — Струнін ведае, што нічога не дасць Надзеі, але не можа аваладаць сваімі пачуццямі. Дужа шкодзіць выкананню імкненне акцёра да дэкламацыі, што цалкам не ўласціва сціпламу і шчыраму доктару.

Трэцяму герою — Лукіну (А. Бурлак) адведзена ў спектаклі не шмат месца. Але акцёр здолеў паказаць упэўненасць свайго героя, яго імкненне павучаць і — не дзейнічаць.

Мы глядзім сёння на персанажаў п'есы М. Горкага не толькі вачыма аўтара. Мы бачым і больш, і глыбей: свабодна прачытваем філасофію твора аб дабры і злу, аб сапраўднай чалавечай годнасці, і дадаем нешта сваё, сённяшняе. Працэс жа ўспрыняцця твора мастацтва (і гледачамі, і акцёрамі) — не пасіўнае ўсеядзенне, а актыўная сатворчасць.

Але часам спроба «свежага» прачытання бывае недарэчнай. У гэтым можна папракнуць рэжысёра А. Струніна, які адважыўся ў фінале спектакля паспрачацца з аўтарам. А гэта прагучала рэзкім дысанансам і з п'есай, і з многім трапна знойдзеным у спектаклі.

...За сцэнай чуецца стрэл: Надзея скончыла жыццё самагубствам. Узрушаны Цыганоў не можа зразумець, як можна так спакойна, без жалю пакінуць жыццё. Чыркун губляецца і пачынае мітусіцца. Важка ступае Манахаў, на руках у якога цела Надзеі у яркім пунцовым плашчы. Манахаў кладзе цела жонкі на кароценькую канапку, а пасля жаласліва звяртаецца да прысутных. Меркне святло, і адзін толькі прамень выхоплівае з паўзмроку схіленую ў адчаі галаву Манахава. Ціха ідзе заслона...

З такім фіналам нельга пагадзіцца. Навошта гэтая фальшывая прыгажосць? Навошта гэтая настойлівая нота слязлівай меладрамы? Навошта такая ўсёдаравальнасць у дачыненні да Манахава? Фінал, зроблены з разлікам расчуліць гледача, пярэчыць і строгай думцы Горкага, і самой плыні спектакля.

Размова аб «Варварах» гродзенцаў была б няпоўная, калі б я не сказаў некалькі слоў пра мастацкае афармленне спектакля, з густам зробленае М. Апіокам на вельмі невыгоднай для мастака сцэне. Яно выразна перадае атмасферу таго жыцця, якім жывуць верхапольцы.

Свой спектакль гродзенцы прысвяцілі 50-годдзю Кастрычніка. І з гэтай прычыны да яго нельга ставіцца, як да звычайнай прэм'еры — адбылася, а там як бог на душу. Тым больш, што тэатр не выкарыстаў яшчэ ўсіх багаццяў п'есы...

Алег САННІКАЎ.

У сярэдняй школе, якая знаходзіцца ў вёсцы Харціца, Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, займаюцца дзеці калгаснікаў калгаса «Праўда». У школе створана студыя баяністаў. Групу ўдзельнікаў гэтай студыі вы бачыце на здымку.

Фота Л. ЭЙДЗІНА.

ПЫТАННІ НАДЗЁННЫЯ, ВАЖНЫЯ

СХОД СЕКЦЫІ МАСТАЦКАГА ПЕРАКЛАДУ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

14 снежня адбыўся справаздачна-выбарны сход секцыі мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў БССР. Справаздачны даклад зрабіў старшыня бюро секцыі Язэп Семяжон.

— Секцыя мастацкага перакладу — самая маладая ў нашым саюзе, — адзначыў ён. — Яна створана толькі некалькі гадоў таму назад. Неабходнасць аб'яднаць майстроў перакладу ў творчую секцыю была падрыхтавана жыццём. З кожным днём мацнеюць сувязі беларускага народа з братнімі народамі нашай Радзімы, сацыялістычных краін. Лепшыя творы беларускай літаратуры перайшлі межы рэспублікі. У сваю чаргу, беларускі чытач праяўляе вялікую цікавасць да літаратур братніх народаў, да лепшых твораў прагрэсіўных пісьменнікаў свету.

На сённяшні дзень, гаворыць дакладчык, мы маем значныя зрухі ў справе мастацкага перакладу. Пашырылася «геаграфія» перакладной літаратуры, выраслі новыя маладыя таленты. Дастатнова сказаць, што за апошнія гады на беларускай мове выдадзены творы Шэкспіра, Байрана, Данелайціса, Сыракомлі, «Віцязь у тыгравай шкуры» Руставелі, анталогіі балгарскай, узбекскай, таджыкскай паэзіі, вершы французскіх паэтаў для дзяцей «Краіна Паэмія» і многія іншыя. Цяпер мы маем магчымасць непасрэдна з арыгінала перакладаць з многіх моў свету.

Разам з тым, нашы перакладчыкі працуюць яшчэ не на поўную сілу. Часам тое, што перакладзена на родную мову, вымушана гадамі чакаць выдання. Планаваннем перакладной літаратуры, па сутнасці, амаль ніхто не займаўся. У гэтым годзе секцыя распрацавала перспектыўны план выдання перакладаў на 1967—1971 гады. Аднак выдавецтвы не заўсёды ўлічваюць нашы прапановы, чамусьці пераносяць некаторыя пераклады з году ў год.

Н. Гілевіч і В. Нікіфаровіч, якія выступілі ў спрэчках, выказалі думку, што даўно наспела пытанне аб арганізацыі ў рэспубліцы перыядычнага выдання — альманаха «Гарызонт», у якім друкаваліся б лепшыя пераклады сучаснай прагрэсіўнай літаратуры.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Я. Брыль выказаў заўвагі па перспектыўнаму плану выпуску перакладной літаратуры на 1967—1971 гады, папракнуў бюро секцыі за недастатковы кантроль за якасцю перакладаў.

Аб неабходнасці паляпшэння якасці перакладаў гаварыў і Ю. Гаўрук. М. Татур крытыкаваў выдавецтва «Беларусь» за недастатковую ўвагу да перакладных твораў, прапанаваў стварыць у выдавецтве асобную рэдакцыю мастацкага перакладу.

На сходзе выбрана новае бюро секцыі. У яго ўвайшлі: Ю. Гаўрук, Н. Гілевіч, Хв. Жычка, Я. Семяжон і М. Татур. Старшынёй бюро абраны Я. Семяжон, намеснікам — Н. Гілевіч, сакратаром — Хв. Жычка.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ШУКАЮЧЫ СВАЁ, НЕПАЎТОРНАЕ

У Мінскім мастацкім салон-магазіне разгорнута персанальная выстаўка твораў віцебскага мастака Уладзіміра Кухарава, прысвечаная пяцідзесяцігоддзю з дня яго нараджэння. На выстаўцы экспануецца некалькі дзесяткаў работ — пераважна партрэтаў і эцюдаў да партрэтаў. Ёсць кампазіцыі, пейзажы Віцебшчыны, Крыма, малюнкі, накіды.

Экспазіцыя сведчыць, што У. Кухараў працуе многа, імкнецца раскрываць разнастайнае ўнутранае жыццё сваіх сучаснікаў — савецкіх людзей, прыгажосць роднай зямлі.

Героі партрэтаў мастака — і ўрачы, і адважныя савецкія партызаны часоў Вялікай Айчыннай вайны, і сённяшнія будаўнікі, і студэнты, і дзеці...

Адразу ж хочацца сказаць, што, знаёмячыся з гэтай разнастайнасцю характараў, занатаваных у партрэтах, усё ж адчуваеш пэўнае нездавальненне. Справа ў тым, што партрэты настолькі па-рознаму напісаны, быццам яны належаць розным жывапісцам. Благога ў гэтым, на першы погляд, нічога няма. Мастак імкнецца ў сваёй творчасці быць, як кажуць, «на ўзроўні часу». Мабыць, для яго надышла пара глыбокага роздуму над вынікамі, якіх дасягаў ён у работах такога плана, як, скажам, карціны «Зоя Касмадзям'янская», «Героі першай партызанскай брыгады». Хутчэй за ўсё гэтыя работы не ва ўсім здавальнялі мастака, выклікалі сумненні, ці не навісла над ім пагроза ўпасці ў натуралізм... Давялося шукаць нейкіх інакшых шляхоў у жывапісе...

Скажам шчыра: імкнучыся да «сучаснай манеры пісьма», да «сучаснага почырку», У. Кухараў не заўсёды ўдала суадносіць якраз вось гэты «почырк» з тымі моцнымі бакамі сваіх здольнасцей, што ёсць у яго як у мастака.

Так, напрыклад, добрае ўражанне пакідае змястоўны партрэт маладой спартсменкі Ларысы Петрык, зусім інакшы па форме, чым шмат якія папярэднія яго работы, напісаныя ў так званай «традыцыйнай» манеры («Урач А. Кухарава», «Бацька Мінай» і іншыя). А вось «Дзяўчынка» нечым нагадвае фармальны пошук такіх мастакоў, як А. Ганчароў, В. Гараеў. Гэты партрэт быццам і «сучасны», але наўрад ці замацоўвае менавіта кухараўскія дасягненні ў пошуках новай для яго выяўленчай мовы.

Вось пейзажы. Цікавыя, з настроем, эцюды Крыма, а таксама напісаныя ў родных мясцінах «зімовая раніца», «Сажалка» і «Вечар». Яны пазбаўлены прэтэнзіі на «сучасную» форму, сведчаць пра ўмельства творцы праз прыроду раскрываць чалавечыя пачуцці. Спробы ж напісаць прыроду па-іншаму, больш шырока, размашыста, не завяршаюцца значнымі вынікамі.

Выстаўка паказвае, што У. Кухараў не жадае эксплуатаваць аднойчы ўдала знойдзены прыём. Для новых думак і пачуццяў ён шукае новыя формы выказвання. На гэтым шляху чакаюць яго і пэўныя творчыя перамогі. Пра гэта сведчаць такія розныя і цікавыя работы, як партрэт Героя Савецкага Саюза Ф. Блахіна, кампазіцыя «Дачка партызана», «Дзяўчынка ў блакітным», «Эцюд дзяўчынкі», малюнкі вугалем (партрэты дзяўчыны і пажылога мужчыны), «Аўтапартрэт», кампазіцыя «Раніца» і некаторыя іншыя.

Добра, што мастака не пакідае творчы неспакой, клопат аб тым, каб выяўленчая мова падпарадкоўвалася тым пачуццям, якія яго хвалююць. Якраз гэта мы і ўбачылі на выстаўцы.

Ул. БРЫГ.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

ВОБРАЗНАСЦЬ, СУГУЧНАЯ ЖЫЦЦЮ

Беларускаму тэатру оперы і балета шанцавала на мастакоў-пастаноўшчыкаў — тут працавалі такія майстры, як М. Бобышаў, П. Вільямс, Б. Матрунін, Б. Волкаў. Вучань К. Каровіна С. Нікалаеў стварыў нацыянальную школу дэкаратараў музычнага тэатра. Мастацкая мова гэтай школы была жывапісная, блізкай да станковай манеры. Вобразныя знаходкі — у духу традыцый тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва перасоўнікаў — грунтаваліся на гісторыка-этнаграфічным прынцыпе.

Новы, сённяшні, зусім не падобны на ўсё папярэдняе кірунак развіцця тэатральнай дэкарацыі ў музычным тэатры рэспублікі звязаны з творчасцю аднаго з вядучых савецкіх мастакоў-дэкаратараў Яўгена Георгіевіча Чамадурава — цяпер галоўнага мастака тэатра.

Творчая манера Я. Чамадурава вылучаецца рэалістычнай вобразнай мовай. Мастаку ўласціва імкненне да маштабнасці, масавых відовішчаў. Яго дэкарацыі заўсёды дакладныя па ідэйнай трактоўцы, лаканічныя, графічныя, дэкаратыўныя па колеру, выразныя і ясныя па архітэктурных вобразах. Пры гэтым ён і прызнаны майстар тэатральнага касцюма.

За плячыма народнага мастака БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Я. Чамадурава вялікі і яркі шлях. Яшчэ студэнтам Акадэміі мастацтваў у 30-я гады ён стварае цікавыя кінаплакаты да фільмаў «Пётр I», «Пугачоў», «Камсамольск», «Прафесар Мамлак». Усё, чаму вучылі яго М. Бобышаў, С. Астравумава-Лебедзева, акадэмік Я. Лансеры, ён пачаў прымяняць на сцэнах Таджыкістана — спачатку з В. Рындзіным, а затым і самастойна.

У пачатку 50-х гадоў Я. Чамадураў працуе ў Маскве галоўным мастаком тэатра імя Маякоўскага. Тут ён афармляе пастаўленую М. Ахлопкавым «Навальніцу». Новае прачытанне п'есы А. Астроўскага і мастацкае афармленне спектакля выклікалі палеміку ў друку.

У творчай біяграфіі майстра многа цікавага... Працуючы ў Румынскай Народнай Рэспубліцы, ён афармляе ў Бухарэсцкім тэатры «Аіду» Дж. Вердзі. Работа мастака высока ацэньваецца тэатральнай грамадскасцю. У рэцэнзіях на спектакль станоўча адзначаецца вобразны, манументальны лад дэкарацый. У 1961 годзе Я. Чамадураў у Фінляндыі разам з балетмайстрам Л. Лаўроўскім працуе над стварэннем «Каменнай кветкі» С. Пракоф'ева. У творчым актыве мастака — удзел у стварэнні Чэлябінскага тэатра оперы і балета, афармленне спектакляў у Вялікім тэатры Саюза ССР, маляўнічы феерверк касцюмаў «Зімовай фантазіі» — першай прэм'еры балета на лёдзе...

У сваіх работах Я. Чамадураў заўжды сучасны. Ён добра адчувае новыя патрабаванні, якія жыццё прад'яўляе нашаму музычнаму тэатру.

— Да «Князя Ігара», — гаворыць Я. Чамадураў, — я вяртаюся чацвёрты раз. Гэтая опера ў маіх дэкарацыях ішла ўжо ў трох тэатрах. Але ва ўсіх (хаця ў кожным асобным выпадку я і імкнуўся да новай сцэнічнай інтэрпрэтацыі) была моцная даніна агульнапрынятай традыцыі, падзеі оперы разгортваліся на магутным, манументальным, але некалькі архаічным фоне.

У апошняй рабоце, якую я рыхтую для Беларускага тэатра оперы і балета, мне захацелася паглядзець на гэты твор, на эпоху, адлюстраваную ў спектаклі, з больш дакладных пазіцый. Бо Русь часоў Ігара — гэта Русь царквы Пакрова на Нерлі, Чарнігаўскага сабора, белакаменных палат Андрэя Багалюбскага, г. зн. Русь цудоўных па сваёй дасканаласці архітэктурных узораў, светлая, адукаваная, з самабытнай культурай. А адсюль — зусім інакшы акцэнт у спектаклі. Ён надае інакшы сэнс таму, што адлюстроўваецца, і дазваляе мастаку вельмі выгадна супрацьпаставіць гераічную і цывілізаваную Русь разбуральнай стыхіі палавецкага нашэсця...

Слухаючы Яўгена Георгіевіча, не магу не падзяліць яго меркаванні, не магу не дзівіцца здольнасці таленту няспынна шукаць і знаходзіць новае, сучаснае там, дзе, здавалася б, усё ўжо даўно знойдзена.

У новым выяўленчым вырашэнні «Князя Ігара» праходзяць тры тэмы: белы колер стройнай архітэктуры Пуціўля — свету Русі, адукаванай дзяржавы; драўляная раскосіца і архаіка двара ўдзельнага князя Галіцкага — свету коснага і тупога; варварскі, дзікі свет стана Канчака.

Эскізы цяпер — у працэсе сцэнічнага ўвасаблення. Усё ў іх падначальваецца вобразнаму раскрыццю названых кантрастаў.

Вось як, напрыклад, вырашаецца адна з карцін.

На сцэне шатры, пакрытыя лямцам. Месяц. А над усім — цыклапічная каменная баба, якая тупа глядзіць на дзіўнае і стракатае жыццё палавецкага стана. Вядома, што каменныя бабы не былі вышэй двух метраў. Мастак наўмысна парушае звыклыя прапорцыі. А калі б ён пакінуў каменнага ідала этнаграфічна дакладным, тады «каменная баба» была проста экспанатам, рэчу, выпадала б з кантэксту спектакля. Мастак знарок акцэнтуе на яе твары тупасць, абыякавасць да падзей і разам з тым жорсткасць і бязлітаснасць. Воляй інтэрпрэтатара яна з прадмета этнаграфічнага пераходзіць у ранг вобраза, робіцца абвостраным сімвалам, які характарызуе дух карціны, сутнасць жорсткіх заваёўнікаў.

Падобны метад работы з гістарычным і этнаграфічным матэрыялам характэрны для ўсёй творчасці Я. Чамадурава. Прыгадаем балет «Святло і цені», калі над сектанцкім раз'юшаным «няспаннем» узнімаўся воблік Хрыста. Гэта быў лік фанатыка, а не звыклая багалепная ікона. У гэтым фантастычным твары з гнойнымі вачыма як бы канцэнтравалася разуменне і ўспрыняцце гледачом сутнасці сектанцкага фанатызму.

Яшчэ прыклад. У «Арэстэі» ў III акце мастак стварае гіганцкую скалу з аблічча, што чымсьці нагадвае твар гіганта Алкінея з Пергамскага алтара, таго, што загінуў ад гневу Афіны, замучаны пітонам... Напружаны, з трагічным зломам брывей, поўны пакуты і тугі твар чалавека служыў у гэтай сцэне драматычным фонам да падзеі (праследаванне Арэста, якога пасля забойства маці мучаць эўменіды — багіні помсты).

Вялікую ролю Я. Чамадураў адводзіць дэталям, прадметам эпохі, арнаментальным матывам, любоўна і прадумана адабраным для перадачы асноўнага зместу задумы, а часцей за ўсё для стварэння незвычайнай або казачнай атмасферы ў спектаклі. Так, напрыклад, у «Золушцы» ім была выбудавана своеасаблівая архітэктура з арнаментальнага матыву са шпалеры XVIII стагоддзя. Невялікі фрагмент арнамента, павялічаны ў шмат разоў і перанесены на сцэну, прыняў аблічча аркады чароўнага палаца.

Падобных вобразных знаходак у мастака многа.

Яшчэ адна рыса яго таленту — рэдкі дар стварацъ сцэнічны касцюм.

Я. Чамадураў лічыць, што кожны касцюм мастаком павінен быць «прыдуманы»: па форме, па стылю, па вобразнасці, а самае галоўнае — касцюм павінен дакладна адпавядаць сваёй канкрэтнай функцыі.

У тэатры, гаворыць мастак, ёсць два падыходы да вырашэння сцэнічнага касцюма. Першы з іх — «касцюм-вобраз» для драматычнага і опернага спектакляў, для кіно і тэлебачання. Пры яго вырашэнні мастак улічвае непаўторнасць характару персанажа, індывідуальнасць акцёра. У эскізе падрабязна распрацоўваецца грым і, у неабходных выпадках, рэквізіт. Такога тыпу касцюмы ствараліся Я. Чамадуравым, калі ён працаваў над «Навальніцай», «Барысам Гадуновым». Зусім інакшы ў яго падыход да вырашэння касцюма харэаграфічнага, эстраднага і, асабліва, цыркавога. У першым з іх умоўная мова класічнага танца прад'яўляе своеасаблівыя патрабаванні. Пластыка акцёра тут павінна быць выяўлена як мага больш моцна і выразна. Улічваецца не толькі характар танца, але і тое, як ён будуецца ў прасторы, парадак фігур. Касцюм каларыстычна павінен вырашацца ў залежнасці ад таго, на якім фоне ён «працуе», г. зн. мастак прыводзіць усё адзенне персанажаў у пэўную рытмічную колерную сістэму.

Я. Чамадураў аддае перавагу такому балетнаму касцюму, у якім гранічна адкрываецца цела танцора: асноўны акцэнт — выяўленне пластыкі чалавечага цела. Пераважае трыко, а на касцюм робіцца толькі «намёк» пры дапамозе выразных дэкаратыўных дэталяў.

Музыка дыктуе мастаку і колерныя рытмы, і колерныя кантрасты касцюмаў. Што ж датычыць канкрэтных колераў, Я. Чамадураў аддае перавагу тым, якія падказаны самім стылем касцюмаў той або іншай эпохі, таго або іншага народа. І яшчэ характэрная дэталь: гледзячы на той або іншы касцюм, створаны Я. Чамадуравым, мы можам дакладна сказаць, які колер асноўны для ўсяго касцюма, які — дадатковы. Напрыклад, у «Балеро» М. Равеля мастак апрануў усіх мужчын-танцораў у адзенне чорнае белым і ў белае з чорным, а танцоўшчыц — у касцюмы чырвоныя з белым. У дысананс ім былі апрануты балерыны, якія вядуць партыю маўрытанскай тэмы, — у жоўтае з чорным. У касцюмах пераважаў чорны колер; ён як бы аб'ядноўваў, «цэментаваў» усе касцюмы харэаграфічнай сцэны.

Лакальныя колерныя спалучэнні надаюць дэкарацыям і касцюмам Я. Чамадурава непаўторнае адценне.

Сярод кніг

БЫЛЫЯ ВЯЗНІ КАРТУЗ-БЯРОЗЫ РАСКАЗВАЮЦЬ...

Было іх шмат тысяч — стойкіх, мужных, самаахвярных. У кожнага — свой летапіс жыцця, свая сцежка, якая выводзіла гарапашнага беларускага селяніна, абяздоленага местачковага рамесніка, гарадскога пралетарыя, абуранага бяспраўем інтэлігента на шлях барацьбы супраць фашысцкага рэжыму ў буржуазна-абшарніцкай Польшчы.

Шлях гэты праходзіў звычай праз засценкі астрогаў, праз так званыя «месцы прымусовай ізаляцыі» для палітычных працаўнікаў дыктатуры Пілсудскага. Такім месцам быў, у прыватнасці, канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картузаўскай— невялікім беларускім гарадку, што стаіць на шашы, якая злучае Брэст з Баранавічамі.

За пяцігадовае існаванне канцэнтрацыйнага лагера ў Бярозе Картузаўскай (ён быў створаны ў 1934 годзе) у ім пабывала каля 10 тысяч чалавек — палякаў і беларусаў, украінцаў і рускіх, яўрэяў і літоўцаў. У большасці сваёй гэта былі камуністы і камсамольцы. Здзек, які чынілі тут пілсудчыкі над тымі, хто выступаў супраць існаваўшага ладу, пакрыў ганьбай так званую буржуазную дэмакратыю. Гвалт і беззаконне ў адносінах да зняволеных з'яўляліся выклікам чалавечай годнасці, абвінавачваннем у адрас прафашысцкага рэжыму.

Усё менш і менш становіцца жывых сведкаў жахаў Картуз-Бярозы. А для малодшага пакалення ўсё гэта наогул здаецца зусім далёкім, амаль што нерэальным. А яму трэба абавязкова ведаць пра барацьбу бацькоў супраць фашызму і свята памятаць пра ахвяры, што прынесены былі ў імя свабоды радзімы... Вось чаму такім своечасовым і патрэбным з'яўляецца выхад у свет зборніка ўспамінаў былых вязняў Картуз-Бярозы «Яны не сталі на калені».

Зборнік выдадзены пад грыфам Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР. Яго склалі і літаратурна апрацавалі кандыдат гістарычных навук В. Посе і Л. Аржаева.

У зборніку, акрамя сарака артыкулаў-успамінаў, змешчана больш трох дзесяткаў розных дакументальных матэрыялаў і шмат фотаілюстрацый. Гэта акалічнасць робіць зборнік своеасаблівым даведнікам для тых, хто займаецца глыбокім вывучэннем нацыянальна-вызваленчай і класавай барацьбы ў апошняе дзесяцігоддзе буржуазна-абшарніцкай Польшчы. Большая частка дакументаў, якія ўзяты з фондаў акупацыйных улад і захоўваюцца ў архівах Беларускай ССР, друкуецца ўпершыню.

Высокая культура апрацоўкі дакументальнага матэрыялу і дастаткова навуковае абгрунтаванне фактаў, якія маюць непасрэдныя адносіны да асноўнай тэмы ўспамінаў, з'яўляюцца важным фактарам перакануўчага ўздзеяння кнігі на чытача.

Станоўчай ацэнкі заслугоўвае і структура зборніка. Пры такой вялікай колькасці аўтараў, якія апісваюць падзеі, абмежаваныя адным часам і адным месцам дзеяння, складальнікам зборніка ўдалося пазбегнуць дубліравання і паўтораў. Гэта было дасягнута імі дзякуючы ўмелай селекцыі матэрыялу. Размяшчэнне ўспамінаў у зборніку па храналагічнаму прынцыпу, а не па алфавіту прозвішчаў аўтараў, звязала гэтыя ўспаміны ў адзіны больш-менш суцэльны расказ.

І ўсё ж аўтарскаму калектыву не ўдалося пазбегнуць некаторай фрагментнасці пры стварэнні агульнага малюнка. Таму складальнікі правільна зрабілі, што рашылі на першых старонках зборніка пазнаёміць чытача ў агульных рысах з гістарычнай абстаноўкай, пры якой функцыянаваў канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картузаўскай. Шкада толькі, што складальнікі не адаслалі чытача да перакладзенай на беларускую мову дакументальнай аповесці Міхаіла Мірскага «Бягом, марш!», выдадзенай у Мінску ў 1963 годзе. Гэта аповесць дала б чытачу яшчэ больш поўную карціну канцлагера.

Хочацца адзначыць яшчэ адну акалічнасць, якой будзе незадаволены чытач. Гэта — вельмі скупыя аўтабіяграфічныя звесткі, што змешчаны пад фатаграфіямі аўтараў успамінаў.

Няблага было б таксама па прыкладу складальнікаў польскага зборніка «Беразякі» (ён таксама пра вязняў Картузы Бярозаўскай) змясціць у канцы спіс былых вязняў, успаміны якіх не надрукаваны.

Выхад у свет зборніка «Яны не сталі на калені» з'яўляецца добрым падарункам шырокаму колу чытачоў. Зборнік папоўніць абмежаваную ў Беларусі колькасць мемуарнай літаратуры падобнага роду.

Васіль ТАЛСТОЙ.

«Они не стали на колени». Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1966.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Л. Аўэрбах. Сімфанічная музыка для ўсіх (як разумець сімфанічную музыку). Мастацкай самадзейнасці. На рускай мове. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 5.000 экз. 44 стар. Цана 16 кап.

Сцяпан Гаўрусёў. Ураган. Вершы. Мастак Л. Чурко. 1966 г. Тыраж 6.000 экз. 184 стар. Цана 32 кап.

Кастусь Кірэенка. Цёплая радуга. Паэзія. Мастак П. Драчоў. 1966 г. Тыраж 6.000 экз. 128 стар. Цана 37 кап.

Аркадзь Куляшоў. Збор твораў у чатырох тамах. Том II. Вершы і паэмы. Мастак Б. Забораў. 1966 г. Тыраж 9.500 экз. 376 стар. Цана 81 кап.

Мікола Лупсякоў. На берагах Дняпра. Апавяданні. Мастак Г. Скамарохаў. 1966 г. Тыраж 12.000 экз. 192 стар. Цана 34 кап.

В. Пракудзін. «Наватары» ў сутанах. (Бібліятэчка атэіста) 1966 г. Тыраж 8.000 экз. 60 стар. Цана 5 кап.

Пятро Рунец. Аб чым шэпчыцца аер. Аповесць. Мастак Г. Скамарохаў. 1966 г. Тыраж 10.000 экз. 136 стар. Цана 26 кап.

Кастусь Цвірка. Зайчыкаў хлеб. Вершы. Мастак А. Арціновіч. 1966 г. Тыраж 13.000 экз. 32 стар. Цана 7 кап.

Чувашскія апавяданні. Мастак Л. Чурко. 1966 г. Тыраж 2.000 экз. 320 стар. Цана 51 кап.

Ілья Шахрай. Зялёны ветразь. Казкі. На рускай мове. Мастак В. Аланцьеў. 1966 г. Тыраж 150.000 экз. Цана 18 кап.

Музей абароны брэсцкай крэпасці. Буклет. (На рускай, англійскай і нямецкай мовах). Аўтар тэксту ўдзельнік абароны А. Махнач. Фотаздымкі А і. М. Ананьных, С. Ананка і інш. Мастацкае афармленне І. Бялецкага. 1966 г. Тыраж 74.000 экз. Цана 33 кап.

Віцебск. Альбом. (На беларускай і рускай мовах). Афармленне В. Шаранговіча. Супервокладка і тытул Ю. Зайцава. Аўтар тэксту М. Дарафеенка. Вершы Д. Сіманавіча. Пераклад вершаў на беларускую мову С. Гаўрусёва. Фотаздымкі А. і М. Ананьных, Г. Бяліцкага, Л. Клімава, У. Крука, П. Люмарова, Д. Прэса і інш. 1966 г. Тыраж 15.000 экз. Цана 1 руб. 20 кап.

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ: Валянціна КОЛТУН

Некалькі дзён назад Мікола Хведаровіч, Сцяпан Александровіч і я былі ў Львове, цудоўным украінскім горадзе. Прыехалі сюды, каб прыняць удзел у вечары, прысвечаным 75-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

Тут, на вечары, праведзеным па ініцыятыве студэнтаў-беларусаў, якія навучаюцца ў Львове, а таксама выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта Львоўскага універсітэта імя Франка, Сяргей Панізнік (ён таксама вучыцца ў Львове) і пазнаёміў нас з Валяй Колтун—студэнткай трэцяга курса універсітэта. Валя выступіла на вечары, чытала вершы М. Багдановіча. Назаўтра яна была на нашай сустрэчы з супрацоўнікамі часопіса «Жовтень», чытала свае вершы. Яны нам спадабаліся. Тут я даведаўся, што Валю ў часопісе ведаюць, бо друкавалі ў перакладзе на украінскую мову некалькі яе вершаў.

Вершы Валянціны Колтун (яна нарадзілася ў Рэчыцкім раёне, потым жыла і вучылася на Піншчыне) своеасаблівыя. Своеасаблівыя сваімі задумамі, сваімі вобразамі, у прыватнасці, параўнаннямі. Зялёныя яблокі яна параўноўвае з папаратнікам, чорнага бусла — з чорным дэманам і г. д. Аб тым, які ёмісты ў яе часам вобраз, якую сэнсава-мастацкую нагрузку нясе ён, можна меркаваць хоць бы па такім вершы, як «Чорны бусел» — такім паэтычным і такім змястоўным.

Валянціна з цікавасцю вывучае літаратуру і мову братняй Украіны, і гэта, безумоўна, прынясе толькі карысць як паэтэсе.

Хораша расце і папаўняецца новымі сіламі наша паэзія! Вось і яшчэ адно імя — Валянціна Колтун. І мне прыемна прадставіць яе чытачам газеты «Літаратура і мастацтва».

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

ЧОРНЫ БУСЕЛ

Я чула, што у нас, на Беларусі,
у Белавежскай пушчы векавой,
жыве, як чорны дэман, чорны
бусел.
На свет глядзіць ён з чорнаю
тугой.

Нібы праклянцце, лётае над намі,
клякоча грозна, як цяжкі набат.
І у буслянцы ў дзікай глухамані
гадуе дзіўна белых птушанят.

Я гляну ўвысь: ляціць...
І бачу—хмары
па-над жывым і радасным
плывуць
мінуўшчынай над сцішаным
папарам,
каб нашы сэрцы водгуллем
крануць.

О, чорны бусел...

■ ■ ■

Золак — лось сахаты —
долы узрыхліў.
Выйду з светлай хаты,
пашукаю сілы.
Можа, дзе пад дубам
скарб знайду-адкрыю.
Стануць рукі грубымі,
валасы — сівымі.
Людзям дзівасілу
здолець адшукаць бы...
Таму хопіць крылам
стыць у ціхай хаце!
Мо' ў пыле, заўзятая,
упаду на поле —
прарасту зярнатамі
ад любві і болю...

■ ■ ■

Нагадваючы самае святое,
дрыжыць напятым нервам тонкі
гук.
Музыкі позірк — здзіўлены,
нястомны,
глядзіць на крылы падаючых рук.
І вось сплятуцца гукі гарманічна.
Званчэй, цішэй—узор сатчэцца
ўміг.
То густа зашуміць прастор
пшанічны,
то выбухне агонь пакут людскіх.
І зноўку ціха... Ападаюць лісці...
Усхліпне бераг соннаю вадой...
І самы непрыкметны гарманісцік
Ў мяне і зорак адбярэ спакой.

■ ■ ■

Над вёскаю зялёныя аблокі,
як папаратнік, згуслі ў вышыні.
Здаецца неба возерам,
дзе ў глеўкай,
стаячай ціне бліскаюць ліні...
І, як галлё сасновае,
над ім
вятры блукаюць з пошумам
глухім.

ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦУ СПАБОРНІЦТВА

Пасторнае светлае памяшканне з вялікімі на ўсю сцяну вокнамі-вітрынамі, навейшае абсталяванне, кветкі. Так выглядае адзін з лепшых у Мінску кніжны магазін № 25, што на Валгаградскай вуліцы. Тут створаны ўсе ўмовы, каб наведвальнік мог уважліва азнаёміцца з навінкамі, у выпадку патрэбы пасядзець за столікам і пагартаць кнігу, атрымаць кваліфікаваную параду ад брыгады работнікаў магазіна, якую ўзначальвае вопытны кніжнік Лілія Баравік.

На працягу трох апошніх год калектыў магазіна (дырэктар А. Зарыцкі) з месяца ў месяц выконвае і перавыконвае планы продажу кніг насельніцтву. За тры кварталы сёлетняга года рэалізавана літаратуры па розных галінах ведаў на 17 тысяч рублёў больш, чым было прадугледжана планам. Зменшыліся залежы кніг, паспяхова прадаецца літаратура мінулых год выдання.

Вялікая ўвага аддаецца пазамагазінным формам гандлю. Магазін мае сем кіёскаў, шэсць столікаў. Напрыклад, Р. Гроднер з кніжнага століка, які стаіць у гастраноме, прадала за тры кварталы больш чым на 5 тысяч рублёў літаратуры мінулых год выдання.

За датэрміновае выкананне плана трэцяга квартала, высокую культуру абслугоўвання пакупнікоў калектыву кніжнага магазіна № 25 прысуджаны пераходны Чырвоны Сцяг і прэмія Камітэта па друку пры Савеце Міністраў СССР.

Дружны калектыў высока трымае годнасць лепшага ў рэспубліцы. 28 лістапада гэтага года выкананы гадавы план. Насельніцтву прададзена кніг на 210 тысяч рублёў. Цяпер работнікі магазіна працуюць у лік другога года пяцігодкі.

Рэпліка

«БЕЗ ЗАДНЯЙ ДУМКІ»...

У дзевятым нумары часопіса «Бярозка» за гэты год надрукаваны артыкул Ул. Якутава «Усебеларускі стараста» — пра былога старшыню ЦВК БССР А. Р. Чарвякова.

Ніякіх прэтэнзій у нас да артыкула няма, акрамя адной — ён амаль цалкам перапісаны з сорак восьмага нумара часопіса «Огонек» за 1964 год, дзе быў змешчаны пад тым жа загалоўкам, толькі, праўда, за другім подпісам...

Абвінавачанне ў плагіяце — справа сур'ёзная, і мы будзем строга прытрымлівацца фактаў.

«ОГОНЕК»

...Август 1921 года. В лесах Белоруссии еще бродят бандитские шайки. А в Дукорскую волость Игуменского уезда приехал председатель ЦИК БССР А. Г. Червяков. На митинге он рассказал крестьянам о Советской власти, о земельной и экономической политике, об организации помощи голодающим Поволжья. В волисполкоме разобрал заявления, просьбы и жалобы крестьян, некоторые разобрал здесь же, на месте, и решил, проверил продовольственное положение волости...

«БЯРОЗКА»

...Жнівень 1921 года. Пачалося мірнае жыццё Савецкай краіны пасля суровых год грамадзянскай вайны.

...У Дукорскую воласць Ігуменскага павета прыехаў старшыня ЦВК БССР Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў. На мітынгу ён расказаў сялянам пра дасягненні маладой Савецкай дзяржавы. У выканкоме валаснога Савета разгледзеў заявы, просьбы, скаргі сялян. Многія пытанні А. Р. Чарвякоў вырашыў на месцы, праверыў харчовае становішча воласці...

«ОГОНЕК»

...Январские дни 1926 года. Со всех концов Белоруссии съехались в Минск делегаты на IV Всебелорусский съезд крестьянских комитетов общественной взаимопомощи. В президиум непрерывно поступают записки: «Будет ли на съезде Червяков?» «Почему нет Червякова? Не заболел ли он?» Крестьяне хотели послушать своего, как они его называли, всебелорусского старосту. Но он был занят, пришел только на последнее заседание и выступил с речью о задачах крестьянских комитетов. Делегаты под бурные аплодисменты избрали его почетным председателем ЦК кресткомов Белоруссии.

...1927 год. Канун 10-летия Октября. Червяков приглашен на открытие вновь построенного клуба имени Червякова на витебской фабрике «Двина». Через три дня фабком получил телеграмму...

«БЯРОЗКА»

...У студзені 1926 года ў Мінску сабраўся IV Усебеларускі з'езд сялянскіх камітэтаў грамадскай узаемадапамогі. З усіх канцоў рэспублікі з'ехаліся на з'езд дэлегаты. Яны пыталіся адзін у аднаго, пісалі запіскі ў прэзідыум: «Ці будзе на з'ездзе Чарвякоў?», «Ці не захварэў ён?» Сяляне хацелі паслухаць свайго, як яны называлі, «усебеларускага старасту». Ён быў вельмі заняты, але прыйшоў на апошняе пасяджэнне і выступіў з прамовай аб задачах сялянскіх камітэтаў.

Дэлегаты пад бурныя апладысменты выбралі яго ганаровым старшынёй ЦК сялянскіх камітэтаў Беларусі.

...1927 год. Пярэдадзень 10-годдзя Кастрычніка. Чарвякоў запрошаны на адкрыццё клуба імя Чарвякова на віцебскай фабрыцы «Дзвіна». Праз некалькі дзён фабрычны камітэт атрымаў тэлеграму...

Здаецца, ясна. Мы не ўтрымаліся і пазванілі Ул. Якутаву. Цікава паслухаць яго самога. Спачатку мы пачулі ўпэўнены голас. Якутаў адрэкамендаваўся як даследчык жыцця і дзейнасці выдатных дзеячаў Камуністычнай партыі Беларусі Чарвякова і Галадзеда.

— Нядаўна закончыў дакументальную аповесць пра Чарвякова, перадаў яе ў часопіс «Полымя».

Тады мы цікавімся ў яго аб прычыне ідэнтычнасці тэкстаў у «Огоньке» і «Бярозцы». Кароткае маўчанне, потым уже не так упэўнена:

— Не памятаю, не можа такога быць...

І яшчэ праз хвіліну:

— А-а... успомніў. Дык нічога страшнага ў гэтым няма. Відаць, мы карысталіся аднымі дакументамі.

Але дакументы тут ні пры чым. І праз паўгадзіны Якутаў сам звоніць у рэдакцыю і ляпеча пра тое, што перапісаў артыкул з «Огонька» «без усякай задняй і пярэдняй (?) думкі». Проста ён лічыў, што аўтар агоньюўскага артыкула — намеснік начальніка Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР М. Камінскі — вельмі эрудзіраваны чалавек, і матэрыял яго апрабаваны, таму, каб не памыліцца з фактамі, ён «трошкі» і спісаў у яго.

Што і казаць, логіка...



ЛЕДАВАЯ ФАНТАЗІЯ.

Фотаэцюд А. ГЛІНСКАГА.

Графічная выразнасць і асаблівая абвостранасць сілуэта, рэзкае выяўленне аднаго колеру другім дазваляюць добра ўспрымаць на сцэне і дэкарацыі і само дзеянне. Спашлюся на адну са сцэн «Арэстэі» — «магілу Агамемнана».

...На чорных ступенях да помніка рухаюцца плакальшчыцы. Яны адзеты ў белыя хітоны і чорныя пакрывалы «палы». Неба насычана сіняе. Касцюм разлічаны на ўспрыняцце разам з белым пахавальным «лекіфам». Калі плакальшчыцы ідуць па прыступках наверх, дык іх хітоны і кубкі гранічна выразна глядзяцца спачатку на фоне падлогі, а затым і неба. Калі кубкі апускаюцца ля стэлы над труной, дык яны рэзка выдзяляюцца на чорным фоне прыступак і ўтвараюць адмысловую колерную кампазіцыю. Дзякуючы гэтаму прыёму, пластычны малюнак мізансцэн выключна даходлівы.

Касцюмы для эстрады, танцавальных ансамбляў Я. Чамадураў стварае не дэтальна-бытавымі, этнаграфічнымі дакладнымі (тэатр — не музей), а з пазіцый сучасных густаў, з улікам прынятай сёння тэатральнай эстэтыкі. Ён цудоўна разумее значэнне касцюма на эстраднай сцэне, дзе касцюм «працуе» адзін, без дэкарацый. Таму пакідае ўсяго адну-дзве характэрныя дэталі, на якіх робіць дэкаратыўны акцэнт і намёк на тыповы сілуэт. Так, у касцюмах «Іспанскага танца», створаных мастаком для другой праграмы маскоўскага «Балета на лёдзе» — тыпова эстраднага, пышна феерычнага прадстаўлення,—для перадачы стыхіі, дынамікі, характарнасці іспанскага танца з усяго нацыянальнага касцюма пакінуты дзве дэталі: веер і шырокія пенныя спадніцы, на кожную з якіх пайшло больш сямідзесяці метраў капрону. Эфект незвычайны. Гэта касцюм Іспаніі, але творча перапрацаваны.

Асаблівае стаўленне ў Я. Чамадурава да касцюма цыркавога. У ім ён востра піша сілуэт, гіпербалізуе форму, дэталі, робіць касцюм гранічна дэкаратыўным, але пры ўсім гэтым захоўваючы высакароднасць колерных спалучэнняў і ліній, улічваючы святочнасць, відовішчнасць цыркавога прадстаўлення, буфонных антрэ, нязвычнасць жанру. Касцюмы для танца «Матрошкі з самаварам», зробленыя мастаком для «Цырка на лёдзе», — добрая ілюстрацыя да сказанага.

На белы, асветлены лёд, пад вясёлую плясавую «Ах, вы сені, мае сені...» выплываюць «бабы» ў незвычайных па памерах, распісаных птушкамі сарафанах-крыналінах, у вострых з падвескамі «кіках» на галовах, у гафрыраваных душагрэях, у кісеі... Відовішча маляўнічае, стылізавана-лубачнае, у духу народнага тэатра.

Я. Чамадураў працуе штодзённа і многа. Цяпер ён стварае новыя касцюмы для Дзяржаўнага ансамбля танца БССР, новыя дэкарацыі да балета «Пасля балю» Г. Вагнера, да опер «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага і «Брэсцкая крэпасць» К. Малчанава. Гэтыя спектаклі тэатр оперы і балета рыхтуе да 50-годдзя Савецкай улады.

У час падрыхтоўчай работы да ўвасаблення той ці іншай задумы мастак старанна накопілвае неабходныя матэрыялы. Замалёўкі ў час паездак па вёсках Беларусі, матэрыялы музеяў (не толькі мясцовых), вывучэнне побыту, непаўторнай атмасферы падзей, пошукі рэдкага іканаграфічнага матэрыялу ў бібліятэках і г. д. — усё гэта дзеля аднаго: знайсці адэкватнае задуме і музычнаму ладу твора.

Накіды і эскізы алоўкам да «Дзяўчыны з Палесся», якая неўзабаве ўбачыць свет у новай рэдакцыі, сведчаць, што галоўнае ўжо знойдзена. Гэта будуць дэкарацыі спектакля героіка-драматычнага плана. Па форме востра-лаканічныя, абагуленыя. Асноўнае ў задуме мастака — вобраз скалечанай і спакутаванай зямлі беларускай, вобразы людзей, якія мужна сустрэлі цяжкую часіну гісторыі, выстаялі, перамаглі фашысцкіх захопнікаў.

Задума афармлення «Брэсцкай крэпасці» выспела ўжо ў тыя дні, калі Я. Чамадураў быў на ўручэнні Брэсцкай цытадэлі «Залатой Зоркі». Тады ён гутарыў з героямі, што засталіся ў жывых, хадзіў па аплыўшых ад агнямётных струменяў казематах.

— Я бачу гэты спектакль, як спектакль-гімн, як спектакль-рэквіем, як спектакль высокага героіка-рамантычнага пафасу,—кажа Яўген Георгіевіч.

Сёння тэатр оперы і балета пераўзбройваецца — нанова аснашчаецца сучаснай апаратурай. У гэтым вялікая заслуга і галоўнага мастака тэатра. У выніку дзейнасці Я. Чамадурава на гэтай пасадзе тэатр стаў больш дакладна вызначаць стаўленне да характару мастацкага афармлення на сваёй сцэне.

Зразумела, што галоўны мастак тэатра не запрашае на пастаноўку таго або іншага мастака. Гэта функцыі мастацкага савета і самога пастаноўшчыка. Галоўны мастак можа толькі раіць. Сучасны тэатр не церпіць механічнага спалучэння мастака і рэжысёра, якія маюць дыяметральна процілеглыя ўяўленні пра спектакль. Адыходзіць у мінулае і так званы «брыгадны» метад афармлення. Толькі прынцып творчага «сааўтарства» аднадумцаў сёння вызначае вартасці, а адсюль—і даўгавечнасць спектакля. Але змагацца з прымітывам, шэрасцю, невыразнасцю, адсутнасцю сапраўднай вобразнасці ў спектаклі галоўны мастак абавязаны. У гэтым прынцыповае значэнне галоўнага мастака ў любым тэатральным калектыве. Умельства парэкамендаваць патрэбнага мастака —гэта таксама частка поспеху спектакля, і на гэтым участку дзейнасці ў галоўнага мастака маральныя абавязкі перад калектывам вельмі вялікія.

Вельмі правільна, што ў тэатры оперы і балета за апошнія гады афармлялі спектаклі такія розныя па почырках мастакі, як У. Кульвановскі, П. Масленікаў, а цяпер запрошаны А. Грыгар'янц. Ва ўсіх гэтых мастакоў ёсць адчуванне музычнага ладу спектакля.

І ў заключэнне хацелася б напомніць адну ісціну: настаўнік павінен мець сваіх вучняў!

Трыццацігадовы вопыт работы Я. Чамадурава ў буйнейшых тэатрах Савецкага Саюза дае яму права, а дакладней—абавязвае рыхтаваць змену. Мне здаецца, было б мэтазгодна пры оперным тэатры выдзеліць некалькі месц для маладых мастакоў-стажораў. Няма нічога больш карыснага для маладых дэкаратараў, як практыка ў буйнейшым тэатры, пад кіраўніцтвам буйнага майстра. У свой час так рыхтаваў для рэспублікі кадры народны мастак БССР С. Нікалаеў. У інтарэсах нацыянальнага тэатральнага мастацтва неабходна аднавіць гэтую добрую традыцыю.

Гурый БАРЫШАЎ.

АПАВЯДАННЕ

Бацька збіраўся ў лес, і Лёнік насцярожана цікаваў за ім, наважваючыся папрасіцца, каб узяў і яго з сабою. Лёнік адчувае, што бацька не возьме, яшчэ і прыкрыкне, ён заўсёды строгі, хмуры, маўклівы. А Лёніку так хочацца ў лес! Ён там ніколі яшчэ не быў. Нідзе ён яшчэ не быў далей свайго двара... Ну, гэта так толькі гаворыцца. Лёнік жа пасвіць гусей, дык штодня ўвесь выган выхадзіць за імі, аж да канавы, за якою пачынаецца поплаў, куды гусей нізашто нельга пускаць, бо там расце ўся ў красках пахучая трава, якую косяць на сена. І яшчэ — ці раз бегаў Лёнік аж на другі канец вёскі; там клады з мноствам крыжоў пад бярозамі і хвоямі; Лёнік заўсёды спуджана ўзіраўся на клады, прыцішаў хаду, але зайсці туды не адважваўся, хоць клады неабгароджаныя — пагніў частакол, разваліўся, уцалелі толькі слупы. За кладамі — Глінішча, глыбозныя ямы, дзе капаюць гліну на печы ды на грубкі; там так цікава палазіць, пагуляць, выграбсці рукамі ды якой палкай у земляной сцяне нішу, вялізную, што можна і схавацца ў ёй... А за Глінішчам — пачынаецца лес, не кусты, не алешнік які, а высокі і густы хвойны лес. Глядзіш туды— усё лес ды лес, далёка, пад самае неба... Пэўна, там на кожным дрэве птушынае гняздо, і пстры кают з галіны на галіну вавёркі... Недзе там, за лесам, заходзіць сонца. Вось бы забрацца туды, глянуць... Эх, каб узяў бацька з сабою!.. Вунь ля двара на вуліцы стаіць запрэжаны конь. Бацька вынішаў у сенцы — чутно, бярэ пілу і сякеру.

Лёнік надзяе на галаву выліналую, з пакамечаным брылем кепку і вышмыгвае з хаты, зіркае на бацьку, хоча адгадаць ягоны настрой. Ну, няхай бы сказаў хоць слова Лёніку, тады б адразу пазнаў Лёнік, ці ў гуморы бацька і ці варта прасіцца ў лес. Маўчыць бацька. Ну, ён ні з кім негаваркі, Лёнік гэта ведае. І яшчэ здагадваецца Лёнік, што бацька не любіць яго. А чаму не любіць? Лёнік жа і слухаецца, і мала калі правініўся перад ім ці перад мамай. Было раз, што ён узяў запалкі на выган, каб раскласці вогнішча. Бацька тады як крыкнуў: «Спаліць хату хочаш, смаркач? Жабракамі зноў зрабіць?!» Біць, праўда, не стаў сам, а сказаў маці: «Вазьмі ды дай яму як след». Маці, канечне, адлупцавала, але яе рука, мусіць, мякчэйшая... І яшчэ аднойчы было, калі Лёнік дастаў з карабка, што ляжыць у скрыні, бацькаў медаль «За адвагу!» і панёс пахваліцца свайму суседу Мішку: «Глянь, які медаль у майго бацькі...» Мішка паглядзеў на медаль, а тады хмыкнуў: «Гэта ж айчымаў...» І шпурнуў медаль. Лёнік стукнуў Мішку кулаком у грудзі. Ну, тут яны і счапіліся. Ды ў валтузні адарваўся медаль ад бляшкі і згубілася недзе тое маленькае колца, на якім медаль трымаўся. За медаль дасталося— бацька так ужо моцна аперазаў папругай, што пісягі на целе засталіся. Лёнік разумее, што вінаваты, — медаль бацьку дарагі, не абы за што медаль далі — за адвагу. Бацька з дзеравяшкай замест нагі, можа, таму ён такі і злосны... Ну, а Мішку дык Лёнік надаваў добра... Хаця што... Гэта ж праўда—айчым. Лёнік чуў часам на людзях пра бацьку: «Ды гэта ж Антось — прымак Раінін...» Раіна — Ленікава маці. Ну, значыць, айчым прыйшоў да іх з другой вёскі. Толькі маці загадала, каб Лёнік зваў яго татам. Лёнік так і заве. А чаму і не... Свайго бацькі ён не помніць, на вайне загінуў. Добра, што хоць гэты ёсць, а то без ніякага бацькі Лёніку і маме было б дрэнна. Яны ж толькі нядаўна яшчэ вылезлі з зямлянкі, усяліліся ў новую хату, а каб не было бацькі, то калі б яшчэ гэтую хату зрабілі... І, можа, няпраўда, што ён недалюблівае Лёніка. Дык чаму не папрасіцца ў лес?.. Бацька едзе па бярвенне на стопку, яму ж цяжка з дзеравяшкай. Лёнік мог бы памагчы яму хоць трохі — ці пілу пацягаць, ці каня за лейцы патрымаць, ці падаць які кол, каб падважыць бервяно, — хоць ён малы, але ж зручней з ім, чым аднаму.

Лёнік сочыць, як бацька кладзе на калёсы пілу, сякеру, вяроўчыну, знімае лейцы з шула і кажа каню:

— Но-о-о, настаяўся ўжо...

Так лагодна сказаў, ну, нібы чалавеку, нібы конь разумее кожнае слоўца... Ад гэтай бацькавай лагоднасці ў Лёніка пацяплела на душы, і ён просіць:

— Вазьміце і мяне, тата...

Антось прыпыніў каня, з натугай закінуў сваю дзеравяшку на калёсы, сеў, тузануў за лейцы:

— Но-о-о! Каб цябе...

Калёсы затарахцелі, і Лёнік заміргаў вачыма, пазіраючы, як пагойдваецца на мулкім сядзенні бацька, ад'язджаючы ад двара.

Ну, Лёнік не вельмі і спадзяваўся на бацькаву дабрату... Трэба гнаць гусей на выган. Топчуцца вунь у загарадцы ля хлява, гергечуць, чакаюць яго. А што? І чакаюць яны, мабыць, як той конь, разумеюць чалавека. І Лёнік разумее гусей, гляне каторай у вока і ўбачыць то просьбу, то недавер, то злосць. А гусак, дык той, як начальнік, вядзе гусей, камандуе. Ён дужы, як махне калі крыламі зблізку, дык шапка можа зляцець з галавы. Асядлаць бы гэтага гусака ды паляцець у лес і далей, за лес, туды, дзе хаваецца сонца... А што?.. Гусей няхай гоніць Ганка, сястрычка, вунь яна выбегла з хаты. Ну, яна яшчэ маленькая, але з гусямі справіцца. А Лёнік памчыцца загарадзем, за Глінішча, а адтуль — у лес. Будзе падбегам ісці паўз дарогу, назіркам за бацькам, а потым дагоніць, скажа, што хоча дапамагчы яму, ну, бацька ўзрадуецца і ўжо ніколі не будзе злавацца на Лёніка пасля гэтага...

— Ганка, папасеш за мяне гусей?

— Я гусака баюся...

— Я табе дам вялізны дубец... Добра?

— Добра. А ты куды?

— Я з татам у лес...

Лёнік выгнаў гусей, знайшоў дубец і даў Ганцы. Дзяўчынка, размахваючы ім, пагнала статак. А Лёнік крутнуўся і, як бачыш, памчаў на загараддзе.

Праз колькі мінут ён ужо быў за Глінішчам. Вунь і дарога нікне ў лесе. Толькі ж нешта не відаць ужо бацькі. Няўжо ён так хутка ехаў?..

Лёнік напрасткі пашыбаваў да лесу. Напачатку лес рэдкі, адны сосны, між ствалоў прасветліны. І Лёнік хутка трапіў на тую самую дарогу, што вядзе з вёскі. Ён глянуў усцяж дарогі—не відаць бацькі. Ну, ды дарога ж віляе туды-сюды, далёка не ўбачыш. Лёнік прыспешыў крок, дайшоў да павароткі, — зноў пуста, нікога няма. Лес тут ужо быў густы, дарога вузейшая. Азіраючыся па баках, Лёнік пабег далей. Потым здагадаўся: калёсы ж павінны вунь як тарахцець па карэнні. Прыпыніўся, прыслухаўся. Нічога не было чуваць.

Раптам ён заўважыў злева спіленыя сосны. Ну, дык тут недзе павінен браць бярвенне бацька. Лёнік павярнуў налева.

Сосны ляжалі не часта, але скрозь і далёка на гэтай дзялянцы. І Лёнік ішоў ды ішоў — ад калоды да калоды. Але нікога нідзе не было.

Наперадзе паўстаў зараснік арэшніку і маладога дубняку. Цёмна там. Лёнік паткнуўся туды, але неўзабаве хутка павярнуў убок. Здалося, вось-вось выскачаць з таго зарасніку ваўкі. Яму стала страшна. Ён зноў прыпусціўся бегчы. Падумаў: «Вярнуся дадому...»

Ён бег і бег, а дарога не паказвалася. Нарэшце стаміўся, ужо не мог бегчы. Задыханы, аблваючыся потам, ледзь валокся, не ведаючы — куды. Упасці б, перадыхнуць... Але страх падганяе і падганяе... Лёнік ужо не бяжыць і не ідзе, а чыкільгае, час ад часу неяк смешна падскокваючы. Раптам з яго грудзей міжволі вырываецца крык:

— Тата!..

Крык гэты здаецца ратункам. Лёнік спыняецца, аддыхваецца і зноў гукае:

— Та-а-та-а-а!..

Толькі рэха ў адказ: а-а-а...

Лёнік нямогла прысядае на дол, прытуліўшыся спіною да камля сасны... Слёзы засцілаюць яго вочы, цякуць па схуднелых замурзаных шчочках. Ён не выцірае слёз, пазіраючы перад сабою і нічога не бачачы. Ужо не хочацца нават шукаць дарогу. І дадому не хочацца. І больш не пойдзе ён у Глінішча рабіць схованку. Памрэ тут. Няхай ваўкі з'ядуць... На кладах многа крыжоў, яшчэ адзін паставіць маці... Бацька не любіць яго, не ўзяў з сабою. Маці, можа, і любіць, але вельмі ўжо патурае бацьку ва ўсім. Хіба што Ганка... Малайчына, згадзілася папасвіць гусей... Як яна там? Ці не кінула гусей, малая ж, і яны мо залезлі куды ў шкоду?.. Мець бы крылы, як у таго гусака, ды ўзляцець над лесам, ды паглядзець, як там Ганка...

Згадка пра гусей, пра Ганку падымае Лёніка. Ён выглядвае сукаватую сасну і, напружваючы ўсе сілы, карабкаецца з сука на сук, з галіны на галіну, аж да верхавіны... Не, нічога не відаць, лес ды лес вакол. Млеюць рукі і ногі. Абадраўшыся аб сукі, Лёнік саслізгвае на дол...

Трэба ісці. А то і Ганцы ўляціць, беднай, і яму. Каб толькі паспець дадому раней за бацьку. Ну, маці — няхай, яе рука мякчэйшая...

Аддыхаўшыся трохі, ён памалу пайшоў. Трапляліся дзялянкі з рэдкім лесам, і тады Лёнік абнадзейваўся, яму мроілася ўперадзе дарога; лес гусцеў, аж не відаць было неба, і Лёнік прыпыняўся, нерашуча азіраўся — ці не павярнуць куды...

Нарэшце, неяк раптам, гушчар абарваўся, і Лёнік ажно скалануўся ад радаснай нечаканасці: так тут было светла і прасторна. Ён ступіў яшчэ крок і прыпыніўся. Нагадалася разора паміж загончыкамі жыта на іхняй сядзібе. Бяжыш па разоры, як паміж дзвюх сцен, і нічога не бачыш, толькі каласы і неба. Так і тут, адно што сцежка гэтая шырокая і па баках не жыта, а дрэвы...

Гэта была прасека. Над ёю стаяла сонца і высокае, блакітнае, з белымі воблачкамі неба. Такое неба Лёнік бачыў на выгане, калі часам, пакуляўшыся на мураве, лажыўся дагары...

Ён глянуў налева—прасека ўпіралася ў лес; глянуў направа — прамая, роўная, прасека ішла далёка-далёка, аж да неба...

Лёнік пазіраў і пазіраў у той бок, а ісці не было ўжо сіл. Ён паволі апусціўся на дол. Было горача. Павекі зліпаліся ад стомы, ён праціраў іх кулачкамі і ўсё пазіраў то на зямлю, то на неба. Адна, зялёная, паласа рассцілалася па зямлі, другая, шырэйшая, сонечна-блакітная, па небе, — там, удалечыні, яны злучаліся... Дзіўна і цікава было Лёніку бачыць гэта. Яму хацелася ведаць, што ж там, дзе злучаюцца зямля і неба, — можа, акіян? Ці пустэльня? Ці канец свету?.. І калі пайсці туды, дык што будзе?..

А павекі зліпаюцца... І Лёніку мроіцца, нібы ён сам зрабіў гэтую прасеку... Толькі навошта ж? Каб злучыць зямлю і неба? Не, каб знайсціся дадому... Ага, гэта ж дарога... Не прасека, а дарога... Недзе там вёска... маці... Ганка... бацька... Лёнікаў бацька, не айчым, ён любіць Лёніка...

Галава Лёніка павісла, потым ён ціха зваліўся на траву, яна тут высокая, шорсткая. Старэнькая кепка адкацілася ўбок.

Сон адалеў Лёніка...

Ідучы з поля на полудзень, Раіна завярнула на выган, каб клікнуць Лёніка. На выгане было шмат і гусей і дзяцей, і яна доўга ўзіралася, каб пазнаць сына. Не магла адшукаць вачыма, тады гукнула. На яе кліч прыбегла Ганка.

— А дзе ж Лёнік? — спытала маці.

— З татам у лес паехаў,—адказала Ганка, размахваючы дубцом.

— Няўжо ж? — усумнілася маці. — Хіба мядзведзь у лесе здох...

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Пры Брэсцкай музычнай школе арганізаваны курсы кіраўнікоў калгасных самадзейных аркестраў. На здымку — выкладчык па класу трубы Л. Ратнер (злева) і кіраўнік духавога аркестра калгаса імя Дзяржынскага Брэсцкага раёна І. Карват.

Фота С. АНАНКІ.

СЕЗОН 1966-67 г.

СУСТРЭЧА З ХАРАСТВОМ

Гэты канцэрт надоўга застанецца ў памяці слухачоў як вялікае свята. Запомніцца радасць сустрэчы з цудоўнай музыкай і не меншае задавальненне ад сустрэчы з выдатнымі выканаўцамі.

Увесь вечар на сцэне—Дзяржаўны народны аркестр БССР. Слухачы добра знаёмыя з майстэрствам гэтага цудоўнага калектыву, які ў маі будучага года будзе адзначаць сваё трыццацігоддзе. За дырыжорскім пультам—заснавальнік і нязменны кіраўнік аркестра, народны артыст БССР прафесар Іосіф Жыновіч.

...Музыка. Яна запоўніла сабой усю залу. Розныя вобразы, розныя настроі, і кожны твор—нібы новае адкрыццё. Аркестр гібкі і рухавы, ён—нібы чысты чалавечы голас, у якім чуваць самыя дробныя адценні пачуццяў...

Радасць вялікага свята, яркае сонечнае святло... Празрыстасць і чысціня пастаральнай карціны, вытрыманай у пяшчотных пастэльных танах... Мужная героіка, што сутыкаецца з пакутамі і трагедыяй, але не зломленая, не скароная, праслаўленая ў народных паданнях... Стыхія танца—то манерна-важная, то імклівa-зухаватая... Імклівасць і парыў, якія спалучаюцца са строгасцю і стрыманасцю пачуцця... Пра ўсё гэта думаеш, гэтым адчуваннем жывеш, калі слухаеш аркестр.

Гучаць «Святочная уверцюра» Д. Смольскага, «Гераічная балада» М. Трахтэнберга, прысвечаная абаронцам Брэсцкай крэпасці, Трэцяя балетная сюіта Д. Шастаковіча, уверцюра да оперы «Сарока-злодзейка» Расіні. Першыя два творы напісаны спецыяльна для аркестра. Два апошнія—майстэрскае пералажэнне, а здаецца, што яны з самага пачатку гучалі менавіта ў народным аркестры—такія яркія фарбы.

Славутая скрыпічная фантазія на тэмы оперы «Кармэн» Бізэ-Сарасатэ набыла нейкі новы арэмат, музыка яшчэ больш наблізілася да народных вытокаў. Веніямін Бурковіч з бляскам іграе сольную партыю, раскрываючы ўсе вялізныя выканаўчыя магчымасці, закладзеныя ў беларускіх цымбалах,—ад пяшчотнейшай кантылены да зіхатлівага каскаду пасажаў...

Слухаеш аркестр і думаеш: чаму ў апошні час так мала пішуць для яго беларускія кампазітары? Зусім нядаўна Народны аркестр выступіў у канцэрце Пятага з'езда кампазітараў Беларусі. Шматлікія госці з розных гарадоў краіны, якія прысутнічалі на канцэрце, высока адзначылі майстэрства таленавітага калектыву, станоўча паставіліся да праграмы. А ў гэтай жа праграме не было ніводнай рэчы, створанай у апошні год ці нават два!

Аркестру вельмі патрэбны новы нацыянальны рэпертуар, і хочацца думаць, што ў юбілейным годзе кампазітары рэспублікі вырашаць гэтую праблему «ў карысць аркестра»...

Але вернемся да канцэрта.

...Спявае заслужаны артыст РСФСР, саліст Вялікага тэатра Саюза ССР Артур Эйзен. Стала ўжо традыцыяй запрашэнне буйнейшых майстроў Вялікага тэатра выступіць з Народным аркестрам. За апошнія пяць год з калектывам спявалі А. Іваноў, А. Огніўцаў, І. Пятроў, А. Вядзернікаў, Я. Кібкала, В. Барысенка. І вось цяпер, ужо трэці раз, з аркестрам пяе Артур Эйзен.

Яго доўга не адпускаюць са сцэны; слухачы кандуюць яго імя пасля кожнага нумара. І гэта зразумела: тыя, хто прыйшлі на гэты канцэрт, — аматары вялікага, сур'ёзнага мастацтва і, сустрэўшыся з вялікім майстрам, па вартасці ацэньваюць гэтае майстэрства.

У артыстычным абліччы А. Эйзена шчасліва спалучаюцца абаяльнасць маладосці і творчая сталасць, «высокі» вакал і цудоўны драматычны талент. Голас спевака мы не аднойчы чулі па радыё, у запісе на грампласцінкі. Але Эйзена трэба не толькі чуць, а і бачыць. Здзіўляе яго майстэрства пераўвасаблення. Канцэртная эстрада — не оперная сцэна; тут спявак — адзін на адзін з музыкай. І калі кожны выкананы твор ператвараецца ў закончаную музычна-драматычную карціну, значыць мастак — сталы майстар.

У канцэрце А. Эйзен спяваў вельмі папулярныя творы—оперныя арыі, песні. Мы чулі гэтую музыку мноства разоў. Але зараз кожны з гэтых твораў адкрываўся для нас нібы нанова, таму што яго спяваў вялікі музыкант, вялікі артыст. Ужо з першых гукаў уступу ён быў далёкі ад сцэны і глядзельнай залы, ён быў там, дзе жыў яго герой, і разам з ім туды ў думках пераносіліся слухачы.

...Завіхураны лес, непраходны гушчар, марозная ноч на зыходзе,—і Іван Сусанін, вялікі сын Русі, у чаканні досвітку развітваецца з жыццём, развітваецца з радзімай...

...Хітраваты, сквапны Мльнар павучае дачку... Апошні шлях старога капрала, мужнага воіна, які горда ідзе на смерць... Плошча нямецкага гарадка і Мефістофель, які з глыбокім сарказмам абвінавачвае «род людскі» ў хцівасці, страсці да «залатога цяльца», з-за якога льецца кроў... Здаецца, бачыш кожную з гэтых карцін, такое яркае, вобразнае мастацтва Эйзена. А голас... У ім—вялізны свет адчутага і перажытага, у ім—само жыццё.

«Блыха» Мусаргскага, «Шатландская песня» Бетховена, рускія народныя песні, песенька Лепелецье з музыкі Ц. Хрэннікава да п'есы «Даўнымдаўно»—«на закуску»... Усё знаёмае і ўсё—новае.

Памяць надоўга захавае гэтую сустрэчу з харастВом.

А. РАКАВА.

НОВЫЯ ГЕРБЫ САВЕЦКІХ ГАРАДОЎ

У сувязі з набліжэннем 50-годдзя Савецкай улады многія гарады аб'явілі конкурсы на складанне сваіх гербаў, а некаторыя гарвыканкомы, прарабіўшы вялікую падрыхтоўчую работу, зацвердзілі гарадскія гербавыя эмблемы.

Ужо распрацаваны новыя гербы Кастрамы і Пензы. Кастрамскі гарвыканком узяў для герба старадаўнюю эмблему горада — плывучую па вадзе старажытную галеру — Кастрама пабудавана на беразе Волгі. Пензенскі гарвыканком, захаваўшы ў новым гербе з невялікімі зменамі старую гарадскую эмблему — «у зялёным полі тры снапы: пшанічны, ячменны і прасяны», якая азначае багацце і ўрадлівасць гэтых земляў, дадаў у герб новыя фігуры. Апошнія азначаюць: уверсе — чырвона-сіняя палоска — частку Дзяржаўнага сцяга РСФСР, хуткакрылая ластаўка на белым фоне — імклівы тэмп развіцця горада; залаты абадок, які ўяўляе сабой схематычны адбітак зубчатага кола ці анкера гадзінніка, — тэхнічны характар сучаснай Пензы.

Жывапісны герб для горада Ленінакана з адлюстраваннем гор, шчодрага сонца і сілуэтаў новабудоўляў стварыў народны мастак СССР Марцірос Сар'ян. Герб быў зацверджаны ў 1964 годзе. Ідзе конкурс на складанне герба сталіцы СССР — Масквы, абмяркоўваюцца праекты герба Ленінграда.

Як і ва ўсіх карысных і цікавых пачынаннях, якія праводзяцца ў нашай краіне, савецкая грамадскасць актыўна ўдзельнічае ў распрацоўцы новых гербаў. Асобныя грамадзяне, гарадскія архітэктары, мастакі, гісторыкі ўносяць праз друк і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных шмат каштоўных і цікавых прапаноў.

У адносінах да герба сучаснага савецкага горада мяркуецца, напрыклад, захаваць традыцыйны шчыт. На ім размяшчаюцца гербавыя фігуры, якія выказваюць у сімвалічнай форме вобраз горада. Верхні ўбор такога шчыта і вонкавыя аздабленні ўказваюць на прыналежнасць горада да Савецкага Саюза. Гэта — адлюстраванне серпа і молата, якія ўваходзяць у герб СССР і гербы саюзных рэспублік.

Для гарадоў, вядомых працоўнымі і баявымі подзвігамі, вонкавыя абрамленні гербавага шчыта могуць быць дапоўнены, па думцы спецыялістаў, адлюстраваннямі ўрадавых узнагарод гораду. Гарадам, якія праславіліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прапануецца змяшчаць над гербавым шчытом пяціканцовую чырвоную звязду ў лаўравым вянку — сімвал доблеснай Савецкай Арміі.

Многія чытачы газет і часопісаў, гісторыкі прапануюць побач з новымі эмблемамі захаваць у гербах старажытных гарадоў найбольш цікавыя старадаўнія эмблемы, вызваліўшы іх ад скажэнняў, унесеных у манархічным ці рэлігійным духу.

Заслугоўвае ўвагі прапанова аб тым, што ў ніжняй частцы гербаў сталіц саюзных рэспублік побач з элементамі дзяржаўнага сцяга рэспублікі трэба змяшчаць дзве злучаныя ў поціску залатыя рукі — сімвал адзінства народаў СССР.

Прапануюць таксама, каб у залежнасці ад агульнай характарыстыкі горада: цэнтр прамысловага ці сельскагаспадарчага раёна, марскі порт — гербавы шчыт меў адпаведнае абрамленне.

Такі далёка няпоўны пералік усіх шматлікіх пісьмаў і прапаноў, якія паступілі ў сувязі з распрацоўкай гербаў гарадоў СССР, якая вядзецца да 50-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Мікалай СПЯРАНСАЎ,
гісторык.
(АДН).

З Гомельскай абласной мастацкай выстаўкі А. МЕЛЬЯНЦ. «Партызаны ў разведцы» (графіка).

КАЛІ НЕ ПАТРЭБНЫ ПЕРАКЛАДЧЫКІ

ЮГАСЛАЎСКІ ТЭАТР У МІНСКУ

Чужая мова гучыць так, што, здаецца, яшчэ хвілінка, і ты пачнеш разумець літаральна кожнае слова.

Галоўны рэжысёр Сербскага народнага тэатра Дзмітрый Джуркавіч гаворыць пра творчае крэда свайго калектыву.

— Мы ў тэатры перакананы, што слова пісьменніка значыць вельмі шмат. Але яшчэ больш мы перакананы, што спектакль—цалкам самастойны, зусім незалежны ад літаратурнай першаасновы твор. Калі ўмоўна сённяшнія тэатры можна падзяліць на літаратурныя і відовішчныя, дык мы—за відовішчныя і супраць літаратурных.

Сам Джуркавіч прыйшоў у тэатр ад «літаратуры», і адмаўленне літаратуры ў тэатры здаецца спачатку крыху нечаканым. Але вось наш субяседнік пачынае тлумачыць, што ён разумее пад незалежнасцю ад літаратурнай першаасновы, і многае робіцца ясным.

— Слова ў спектаклі дранцвее, — кажа Дзмітрый Джуркавіч,—калі яно не падмацавана рухам, святлом, колерам, гукам. У тэатра свае выяўленчыя магчымасці, і ён не мае права задавальняцца толькі тымі метафарамі і сімваламі, якія знайшоў для яго—на паперы!—драматург. Тэатр абавязаны весці свой пошук, і калі ён спыняе яго, то міжволі робіцца мемарыяльна-літаратурным...

Што ж, з такім тлумачэннем можна згадзіцца, хоць не кожны прыме тэрміналогію, якую ўжывае наш сябар. Зрэшты, мастацкае крэда рэжысёра праявяецца на сцэне, а ўчора Навасадскі тэатр пачаў свае гастролі.

Далёка ад нас да Ваяводзіны, але, калі ў Доме мастацтваў акцёры дзвюх партызанскіх рэспублік разгаварыліся, аказалася, што і ў асабістым лёсе многіх удзельнікаў сустрэчы ёсць нямала агульнага.

Гэта пра свае пакуты ў фашысцкіх лагерах смерці расказаў у п'есах «Нябесны атрад» і «Алілуя» Джорджэ Лебавіч. А Мікалай Яроменка ўспомніў, як разам з сербскімі ваеннапалоннымі працаваў пад зямлёй недзе пад Штутгартам...

Калі ў пачатку сустрэчы госці і гаспадары яшчэ кідалі выратавальныя позіркі на перакладчыкаў (растлумачце, маўляў, калі ласка), дык цяпер неабходнасць у іх неяк сама па сабе адпала.

Відаць, якраз гэты «эфект разумення» і меў на ўвазе Дзмітрый Джуркавіч, калі адмовіўся ў час гастроляў ад перакладу спектакляў.

— Калі паказ «відовішчны», — растлумачыў ён, —а мы робім усё, каб нашы паказы былі відовішчныя, «эфект разумення» ўзнікае абавязкова. Глядач разумее нас, мы разумеем і адчуваем яго, хоць паміж глядзельнай залай і сцэнай нацягнута сетка, якая не дае акцёрам магчымасці бачыць партэр.

Сетка, вядома, эксперымент, можа, нават і спрэчны, а вось калі знікае моўны бар'ер — гэта сапраўдны цуд. У ім акцёры маглі перакананацца ў час гастроляў у Кіеве, а яшчэ раней—у час выступленняў у Польскай Народнай Рэспубліцы.

Народны тэатр Новага Сада — старэйшае югаслаўскае «позориште» (разумела нам і гэта слова). «Старэйшы, але не мемарыяльны!» — падкрэслівае Дзмітрый Джуркавіч і дадае, што ён пільна прыглядаецца да пошукаў нашых рэжысёраў. Мастацкі кіраўнік трупы прагледзеў за апошнія гады каля трыццаці нашых спектакляў, а на сцэне тэатра ішлі «Іркуцкая гісторыя», «Тры сястры», «Вішнёвы сад», «Ваўкі і авечкі». Пасля гастроляў трупа пачынае работу над «Ідыётам». Кансультаваць гэтую пастаноўку даў згоду Георгій Таўстаногаў.

М. КОЎСКІ.

На здымку (справа налева) — Джорджэ Лебавіч, Дзмітрый Джуркавіч і акцёры Злата Якаўлевіч, Васа Врціпрашкі, Стэван Шалаіч.

Фота С. АНАНКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

16 снежня

Першая праграма. 16-45—праграма перадач. 16-50—для школьнікаў. Тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя». Перадача з Кішынёва. 17-20—для малых. «Галоўны зорны». Мультыплікацыйны фільм. 17-40—«Подзвігі нашых землякоў». У нас у гасцях клуб «Факел», арганізаваны пры рэдакцыі газеты «Знамя юности». 18-20—тэлевізійныя навіны. 18-35—«Нашчадак Чынгіз-хана». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Межрабпомфільм». 20-00—«Эстафета навін» (М). 21-00—для юнацтва. Н. Далініна. «Яны і мы». Спектакль Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача.

Другая праграма. 11-00—тэлевізійныя навіны (М). 11-15—для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 11-55—«Палітычныя веды—усім» (М). 18-00—тэлевізійныя навіны (М). 18-20—«Навука і тэхніка». Кіначасопіс (М). 18-30—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 19-00—канцэрт (М). 20-00—рэклама, аб'явы. 20-10—А. С. Пушкін. «Граф Нулін». Чытае С. Юрскі. 20-30—«Сябры сярод сяброў». Дакументальны фільм. 21-00—«Ля твайго парога». Мастацкі фільм (М). 22-15—«Музычны маяк» (М).

17 снежня

Першая праграма. 13-55—праграма перадач. 14-00—для школьнікаў. А. Элінскі. «Чорная бурка». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача са Свярдлоўска. 15-30—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Вясёлы час» (М). 16-30—«Народныя музычныя інструменты». Перадача з Львова. 17-00—тэлевізійныя навіны. 17-45—«Беларускія гумарэскі». Канцэрт. Трансляцыя на Маскву. 18-30—«Клуб кінападарожнікаў». (М). 19-30—«На агеньчык» (М). 20-45—тэлевізійныя навіны (М). 21-15—Л. Кручкоўскі. «Адплата». Спектакль Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя А. М. Горкага (М).

18 снежня

Першая праграма. У дапамогу завочнікам. (Для студэнтаў тэхнікумаў). 7-50—«Дэталі машын». 8-20—«Тэарэтычная механіка». (Для студэнтаў вну). 8-50—«Вышэйшая матэматыка». 9-20—«Тэхналогія металаў».

9-55—праграма перадач. 10-00—«Будзільнік» (М). 10-30—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Служыць салдат». Сумесная перадача Вільнюскай студыі і Беларускага тэлебачання. 11-30—«Малюнак горада». Перадача з Ленінграда. 12-00—для школьнікаў. «Прывітанні нашых сяброў». Перадача з Венгрыі. 12-40 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Па слядах мужнасці». Тэлевізійны саюз следапытаў. 13-10—«Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. 13-50—«Музычная шкатулка». 14-10—«Блакітны маршрут». Кінанарыс. 14-30—«Музычны кіёск» (М). 15-00—«Добры дзень, дзеці!» Мастацкі фільм. 16-30—«Маскоўскі Крэмль учора і сёння» (М). 17-00 — Кубак Еўропы па боксу. СССР—Польшча. Перадача з Рыгі. 19-30—кінапанарама (М). 20-40—тэлевізійныя навіны. 21-00 — «Святло і цені» (М). 21-30—«Нашы госці». Канцэрт М. Варшаўскага (віяланчэль). 22-00—па вашых просьбах. «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка», Мастацкі фільм.

Другая праграма. 10-30—для школьнікаў. «Табе, юнацтва!» Перадача з Харкава. 11-30—«З табою, Расія». Дакументальны фільм. 12-40—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма. Перадача з Сочы. 13-10—для школьнікаў. І. Лада. «Заняпалае каралеўства». Тэлеспектакль. Перадача з Ленінграда. 14-30—«Выстаўка Канёнкава». Кінанарыс. 15-00—Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. «Нам песня будаваць і жыць дапамагае». Перадача з Вільнюса. 15-40—«Навіны дня». Кіначасопіс (М). 15-50—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту (М). 18-30—«Зачараваны вандроўнік». Тэлевізійны спектакль. 20.20—да 50-годдзя Савецкай улады. «Памяць пакаленняў». Тэлефільм. 21-30—«Надзвычайнае даручэнне». Мастацкі фільм (М).

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

ПРАСЕКА

— Мядзведзь? Чаму здох?—зацікавілася Ганка, задраўшы галаву і пазіраючы на маці.

— Ат, гэта прымаўка такая, — адказала маці, а сама думала: «От жа неспадзеўка... Як не той Антось... Дай жа бог, каб чалавек прыгарнуўся да дзіцяці...»

Раіна разумела, што Лёнік не сваё дзіця Антосю, пасынак. Разумела і характар Антося. І ўсё ж не раз адчувала яна пякучую гаркату на сваёй душы, калі бачыла, што Антось не любіць Лёніка. Дзіця ж, яно яшчэ няздатнае зрабіць зло чалавеку, дык за што ж яго не любіць? А вось жа так сталася, што Антось неўзлюбіў Лёніка. Тады, калі Антось прыстаў у прымы да яе, Лёніку ішоў толькі чацвёрты гадок. Што ён разумеў? Дзіця горкае! Дык, бывала, і скажа неўпапад, і не паслухаецца. А зноў жа — Антось скалечаны на вайне, сям'я загінула, — перакіпела ў чалавека кожная жылка, адкуль жа быць той дабраце ды злагаднасці. Ну, Раіна бачыла, каго прымала. Але ж, як кажуць, шчасце — не птушка і не ў кожны двор залятае. А двор у яе быў такі, што толькі ветру гуляць: адно за бляшаную трубу, што вытыркала з зямлянкі, і мог зачапіцца той вецер, калі б не круглая ды не дзіравая была тая труба. А сын малы, а радні нікога, а сама знебылася, змарнела, як націна ўвосень... Дык якога ж іншага шчасця чакаць было Раіне... Прыняла яна Антося. Мужчына ж, з рукамі, з галавою, на нагах, хоць з дзеравяшкаю.. Што ж, гаспадар з яго аказаўся добры. Тым часам і Ганка ад яго нарадзілася. Дык да яе ён іншы, хоць таксама ласкі небагата выказвае, але відно, што любіць. Няхай бы прыгарнуў да сэрца і Лёніка... Няхай бы... Лёнік жа дзіця, яно шукае ласкі і спагады, яно можа парадніцца з кожным...

Раіна ўявіла, як недзе Лёнік тупае каля Антося, як двое яны, нібы раўня-мужчыны, скупа перакідваюцца словамі, — і на душы ў яе стала радасна. Яна ўзяла Ганку за ручку, сказала:

— Хадзем, дачушка...

Яны падыходзілі да сваёй хаты, а ў гэты час з другога канца вуліцы набліжалася сюды падвода з бярвеннем. Раіна адчыніла вароты і стала чакаць: ёй прыемна было ўбачыць Антося і Лёніка поруч. Толькі чаму ж Антось адзін? Пэўна, Лёнік затрымаўся з якім хлапчуком на вуліцы або забег у чый-небудзь двор, падумала Раіна, але чамусьці не паверыла ў гэта. І спахмурнела.

Антось завярнуў каня на двор, спыніў, тады, адставіўшы дзеравяшку, скокнуў на здаровую нагу і прыняўся за разгрузку бярвенняў. Раіна падышла памагаць.

— Адыдзі ўжо з сваёй помаччу, —глуха прамовіў Антось.

Бярвенне, праўда, кароткае, не дужа тоўстае, мог бы Антось і адзін паскідаць. Але ўсё ж Раіна не паслухалася, стала памагаць. Антось моўчкі пагадзіўся. Удваіх яны бралі бервяно за канец, знімалі яго з калёс і апускалі на зямлю, а тады ўжо Антось адзін прыпадымаў бервяно за другі канец і спіхваў убок з калёс...

Ганка то зводдалі назірала за іхняй работай, то з бояззю падыходзіла да каня, выстаўляючы ручку і прымаўляючы: «Косю-косю...» Нарэшце запыталася ў бацькі:

— Тата, а дзе ж Лёнік?

Бацька зірнуў спадылба, адказаў:

— Ці ж я за ім хаджу?.. — Пасля невялікай паўзы дадаў: — Дзе ж яму быць, на выгане...

Раіна глянула на Антося, тады на Ганку; нейкая трывога шчымліва азвалася ў яе душы.

— Тата, а ён жа за вамі пабег у лес, — сказала Ганка.

— Я б яму пабег! — злосна кінуў Антось. — І дзесятаму заказаў бы...

Раіна загадала:

— Прабяжы, Ганка, па вуліцы, папытайся ў дзяцей, мо хто бачыў Лёніка.

Ганка пабегла, а Раіна пайшла ў хату рыхтаваць абед. Дастала гаршчкі з печы, расставіла міскі на стале, раскласла аладкі на чатыры кучкі. А з галавы не выходзіў Лёнік.

Увайшоў Антось. Ён ужо ўмыўся на двары, ля студні, прычасаўся, і таму неяк пасвяжэў, памалодзеў, хоць няголены худы твар чарнеўся пруткім шчаціннем. Стукаючы дзеравяшкай, пратупаў да стала, сеў на ўскрайку. Заведзена было ў іх абедаць разам, і ён, чакаючы дзяцей, закурыў.

— А раптам хлопец, і праўда, у лес пацягнуўся? — загаварыла Раіна.

— Нідзе ён не дзенецца, твой хлопец, — адказаў Антось.

«Угу, «твой», — падумала Раіна, — сваім ты не прызнаеш майго сына...»

Уляцела Ганка, паведаміла:

— Ніхто не бачыў Лёніка.. Ды ён жа загараздзем пабег...

— А божачка мой, — усплясніла далонямі Раіна, — што ж гэта рабіць?

— Прыйдзе, чорт яго не возьме, — павысіў голас Антось. — Смаркач! Лупцаваць трэба болей... — Ён кінуў цыгарку, растаптаў яе і рашуча пасунуўся за стол. — Сядайма есці от.

Ганка таксама палезла за стол.

Раіна паднесла гаршчок, паналівала ў тры міскі шчаўя. Але сама не садзілася: трывога на яе душы расла. Нібы пытаючыся ў Антося рады, сказала:

— Шукаць трэба ісці... Заблудзіцца дзіця і прападзе...

Антось прамаўчаў, толькі нахмурыўся.

Ганка паглядзела на маму, пасля на бацьку.

Антось няспешна сёрбаў шчаўе.

— Шукаць трэба ісці, — паўтарыла Раіна, ужо як бы сама сабе. Бо хто ж пойдзе? Антось на дзеравяшцы?.. Але тое, што ён, безуважны, як камень, маўчаў і ў гэтую хвіліну, раптам яе ўзарвала: — Табе нішто мой сын! І я! Маўчун ты праклятый, звер ты бессардэчны!.. Прападзі ты пропадам, такое жыццё! — Яна заплакала на ўсю хату.

Ганка выскачыла з-за стала, плачучы, учапілася за мацерыну спадніцу.

— Цыц! — сыкнуў Антось.

— Хадзем, мамачка, шукаць, — сказала скрозь слёзы Ганка.

— Я табе от пайду!—Антось падхапіўся, распяразваючы папругу.

— Бі, татка, бі, пайду ўсё роўна, пайду, пайду, пайду...

— Ах ты, брыдота!—раз'юшыўся Антось: ніколі яшчэ не было, каб гэтае малое так паказвала сваю натуру; то трэба, пакуль не позна, ламаць гэтую натуру. Ён замахнуўся папругай, але ў гэты момант паслізнуўся дзеравяшкай і, не ўтрымаўшыся на адной назе, рухнуў на падлогу.

Раіна сцепанулася, ускінула рукамі, намерваючыся падтрымаць Антося, але не паспела і са скрухай ці дакорам у заплаканых вачах як бы застыла на месцы. Ганка крутнулася, здзівілася, што бацька ўпаў, і перастала плакаць. Абедзьве яны нема пазіралі, як Антось шкрабаў дзеравяшкай па падлозе, нязграбна падымаючыся. Відно было, што ён астыў і нібы ўраз аслабеў. І, можа, не таму, што ўпаў, а таму, што ні жонка, ні дачка не кінуліся памагаць яму ўстаць...

Падняўшыся, ён падперазаўся і пасунуўся з хаты.

Раіна глянула ў акно: Антось падышоў да каня і стаў падцягваць церасядзельнік.

— Канчай палуднаваць, дачушка,—сказала Раіна, выціраючы вочы,—ды хуценька ідзі на выган. Гусі ж адны, без нагляду... А я паеду з бацькам...

Калі яна выйшла на двор, Антось ужо сядзеў на калёсах і выкіроўваў каня на вуліцу.

— І я паеду,—сказала Раіна.

Антось не азваўся. Яна ішла следам за калёсамі. Ужо на вуліцы ён нацягнуў лейцы, нязлосна тпрукнуў. Конь прыпыніўся. Раіна села.

Моўчкі ехалі.

У лесе Антось прыпыніў каня. Вузкая, ледзь заўважная, паросла травою і ўсыпаная шышкамі дарога адгаліноўвалася тут улева.

— Ты ідзі паўз дарогу і аклікай,—сказаў Антось Раіне.—А я павярну тут... З таго боку аб'еду гушчар...

Скрозь па дарожцы вытыркалася з зямлі карэнне. Так трэсла, што Антось вылаяўся і злез з калёс. Але і ісці цяжка было, каб паспяваць за канём. Задыхаўшыся, ён вылаяўся і зноў узабраўся на калёсы. Злосць апаноўвала яго. Былі б абедзьве здаровыя нагі, дык на чорта б яму гэты конь, не тросся б па гэтым карэнні. А чаго ён трасецца? Столькі работы, і ўсюды няўпраўка, а ён от шкандыбае па лесе, абдзірае восямі камлі дрэў... Ну ж, паганец, папомніш ты!..

Далёка ад'ехаў Антось. Не чутна ўжо Раінінага галёкання. Тады ён спахопліваецца, што трэба ж і яму гукаць. Але злосць не ўлягаецца, і язык не паварочваецца, каб зваць пасынка. А можа, не толькі злосць тут прычына. Яшчэ тое, што Антось, здаецца, ніколі не звяртаўся да пасынка па імені, абыходзіўся займеннікамі: «Ты!», «Ён», «Эй, ты!» Але трэба гукаць. Нарэшце ён прыкладае далоні да рота і крычыць:

— Эгэ-гэ-э-эй!..

Здалёку адгукаецца рэха.

Праз колькі часу Антось зноў прымушае сябе крыкнуць:

— Эгэ-гэ-э-эй!..

Віецца лясная дарожка, ляскаюць калёсы, гухаюць капыты па дрогкай лясной зямлі, гукае Антось... Дзе яно, тое жабяня?.. Злуецца Антось. Замест таго каб нешта рабіць, ён от швэндаецца па лесе. Ну ж і папомніш ты!..

Вось прасека.

Антось спыняе каня, злазіць з калёс, узіраецца ў даль прасекі. Не, нікога не відаць. Ён ідзе прасекай і гукае:

— Эгэ-гэ-э-эй!..

Бунь там, здаецца, шавяльнулася трава...

— Эгэ-гэ-э-эй!..

Ну, так, ён, паганец. Падхапіўся і працірае вочы... Я ж табе!..

Антось шкандыбае да Лёніка.

Лёнік няўцямна пазірае на бацьку. Лёнік хоча зразумець, што здарылася і дзе ён. Роўная зялёная паласа сцелецца перад ім. Па баках—лес, як сцяна. А ўверсе—таксама паласа, толькі шырэйшая і блакітная. Сонца не відаць ужо з-за вяршынь дрэў. Ага, гэта Лёнік сніў, што сам ён разаслаў гэтыя палосы—і на зямлі, і на небе, і злучыў іх... Адкуль жа тут бацька? Можа, сніў ён і бацьку, толькі такога, што не б'е, не крыўдзіць яго... Ага, гэта ж Лёнік сам пабег у лес, без дазволу. І вунь ідзе бацька, пахмурны, злосны. Адзін крок яго гулкі, з шоргатам, другі—з дзеравяшкай, ціхі, зусім інакшы...

Лёнік дрыжыць. Лета, а холадна...

Антось падступае зусім блізка, а ўсё яшчэ ні чога не гаворыць.

Лёнік апускае вочы і не ўзнімае іх: ат, што будзе, тое будзе...

— Паганец!—нарэшце выціскае праз зубы Антось і знімае з пояса папругу. Жылістыя рукі яго дрыжаць, і ўвесь ён кіпіць злосцю, ажно раздзімаюцца і так шырокія ноздры яго сухога храшчаватага носа. Размахнуўшыся, ён апяразвае Лёніка і раз, і другі...

Так пеканула боль, што Лёнік не стрымаўся, зачмыхаў скрозь слёзы:

— Я хацеў вам памагчы... Вам жа цяжка аднаму...

— От я памагу табе!—крычыць у ярасці Антось і зноў замахваецца папругай, але раптам рука яго нібы вяне і паціху апускаецца ўніз. Памагчы, кажаш?... Ага, Антось, што ты варты?..

Нібы вярнулася тая самая нямогласць, што працяла яго ў хаце, калі ён бразнуўся вобземлю...

Ага, мне трэба помач... Што я? Калека нячасны... Рву свае жылы... Колькі яшчэ я праліпею на гэтым свеце?.. І няма ж у мяне свайго сына... Ну, Ганка... А сын—гэта ж сын...

Антось адвярнуўся, стаў падпяразвацца. Пальцы былі як драўляныя, і ён доўга марудліва ўдзяваў папругу ў петлі штаноў. Потым павярнуўся да Лёніка, ступіў да яго, тады адхіснуўся, паглядзеў вакол—ці няма каго дзе,—здалося, што будзе сорамна, што адступіцца ён ад нечага свайго, калі возьме Лёніка за ручку,—але ўзяў і павёў яго...

На доле засталася ляжаць злінялая, зношаная Лёнікава кепка. Ні Лёнік не ўспомніў пра яе, ні Антось не заўважыў, што сын з голай галавой...

Яны ішлі поруч па прасецы, ішлі да калёс. Чулі, як конь весела фыркаў, шмуруючы мордай у шорсткай траве, вышукваючы смачнейшыя калівы...

Літаратура і мастацтва 4

Пятніца, 16 снежня 1966 года.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 13982